ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Серада, 27 кастрычніка 1937 г. № 55 (326)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

Працоўныя Менска, Гомеля, Віцебска вызначылі кандыдатамі ў дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР

вялікага правадыра народаў, друга працоўных БССР Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, сталінскіх наркомаў таварышоў Варашылава, Кагановіча і Ежова.

Рабочыя Гомеля вызначылі кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза выконваючага абавязкі першага сакратара ЦК КП(б)Б тав. Волкава.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

25 кастрычніка 1937 года адбыўся пленум ЦК КП(б) Беларусі.

Пленум выбраў выконваючым абавязкі трэцяга сакратара ЦК КП(б)Б т. Рэпінскага М. Я., раней працаваўшага в. а. першага сакратара Слуцкага АК КП(б)Б.

Пленум давыбраў членамі Бюро ЦК КП(б)Б тт. Ананьева А. А. і Цвяткова А. Ф. і кандыдатам у члены Бюро ЦК тав. Жаброва І. А.

Мастацкія сродкі ў дапамогу выбарам

Краіна Советаў знаходзіцца напярэдадні вялікіх урачыстасцей соцыялізма—20-й гадавіны Кастрычніцкай пролетарскай рэволюцыі і выбараў у Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Слаўны шлях прайшла наша казачная, наша багатая радзіма—наша маці. Наш гераічны народ вякамі адстойваў яе ў кровепралітных баях з усякімі ворагамі. Ён адстаяў яе у рашучай схватцы з міжнародным імперыялізмам дваццаць год назад. Ён перамог. Перамог таму, што ў першых радах барацьбітоў за сваю бацькаўшчыну ішоў згуртованы комуністычнай партыяй пролетарыят і ў першую чаргу рускі пролетарыят, ведучы за сабой бядняцкае сялянства; перамог таму, што ўсёй барацьбой народа з прыгняталынікам—капіталізмам кіравала слаўная комуністычная партыя большэвікоў, кіравалі вялікія палкаводцы рэволюцыі, вялікія геніі перадавога чалавецтва Ленін і Сталін. Вось яна ўзрасла наша маці-радзіма і чырвоным зьнакам узвышаецца над усім змрочным, дажываючым апошнія дні, капіталістычным светам. Усё перадавое чалавецтва свету глядзіць на яе сусветныя заваёвы, увесь працоўны народ любіць яе, як сваю маці, сваю пролетарскую бацькаўшчыну. Аб яе перамогі, перамогі совецкага народа, дасягнутыя пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, разбіваюцца ўсякія планы фашысцкіх інтэрвентаў і іх прыхлябацеляў трацкісцка-бухарынскіх бандытаў. Совецкі народ, як зяніцу вока, беражэ сваю краіну, пад кіраўніцтвам слаўнага вучня вялікага Сталіна—Нікалая Іванавіча Ежова канчаткова дабівае ворагаў—трацкістаў, бухарынцаў, фашысцкіх шпіёнаў і дыверсантаў. Совецкі народ цесна згуртован вакол комуністычнай партыі, вакол свайго любімага правадыра таварыша Сталіна. Комуністычная партыя—гэта яго родная партыя, якая гарою стаіць за яго інтарэсы, інтарэсы народа.

І цяпер, калі настаў час вылучыць кандыдатаў у вышэйшую народную ўладу—у Вярхоўны Совет Саюза ССР, увесь совецкі народ у адзіным парыве вылучае таго, хто ішоў з ім, з народам у цяжкія годы рэволюцыі на самыя адказныя фронты бараніць сваю радзіму, хто даў народу самы шчаслівы, самы дэмакратычны ў свеце закон—Сталінскую Канстытуцыю, у якой узаконены заваёваныя правы на гарантованую працу, на асвету, на адпачынак, на поўнапраўе нацый і рас,—народ вылучае таго, хто адстойваў і адстойвае яго інтарэсы, народ вылучае першымі кандыдатамі ў Вярхоўны Совет тварца Канстытуцыі, найвялікшага чалавека зямлі, дарагога Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, яго баявых саратнікаў, лепшых выхаванцаў—верных дачок і сыноў соцыялістычнай радзімы.

У Маскве і Ленінградзе на прадпрыемствах адбыліся сходы рабочых і служачых, а таксама акруговыя перадвыбарчыя нарады. Маскоўскія і ленінградскія рабочыя—прадстаўнікі перадавога ў свеце рабочага класа вылучылі першымі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Саюза таварышоў Сталіна, Молотава, Кагановіча, Варашылава, Калініна, Ежова, Мікаяна, Жданава, Хрушчова, Пічугіну, Сметаніна.

Аб'яднаныя агульныя перадвыбарчыя сходы рабочых, сялян і служачых выбарчых акруг Маскоўскай вобласці вылучылі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Саюза таварышоў Сталіна, Молатава, Кагановіча, Варашылава, Хрушчова, Сметаніна, Молакава і Сідарава.

На сходах менскіх прадпрыемстваў, установ і вайсковых часцей, якія праходзяць з выключным энтузіязмам, кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Саюза вылучаны таварышы Сталін і яго паплечнік нарком абароны таварыш Варашылаў.

Рабочыя прадпрыемстваў Віцебска і Гомеля вылучылі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета тт. Сталіна, Варашылава, Кагановіча, Ежова, Волкава і Багачову.

[illegible]Вылучэнне кандыдатамі ў дэпутаты [illegible]шага органа совецкай улады—[illegible]чага Совета СССР правадыроў [illegible]кага чалавецтва і знатных лю[illegible] краіны—стаханаўцаў, герояў [illegible] самы гарачы водгук па ўсёй [illegible]най зямлі вялікага Совецкага [illegible]а ўсіх канцах соцыялістычнай радзімы праходзяць шматлікія многатысячныя мітынгі. Увесь совецкі народ вітае першага кандыдата ў дэпутаты Совета Саюза—тварца Канстытуцыі, найвялікшага з вялікіх геніяў чалавецтва таварыша Сталіна і яго баявых саратнікаў. Мітынгі і сходы ператвараюцца ў народную дэманстрацыю любові і адданасці народа сваёй комуністычнай партыі большэвікоў, любові і адданасці Сталінскаму ЦК.

Выбарчая кампанія шырока разгарнулася ва ўсёй краіне. Партыйныя і комсамольскія арганізацыі на прадпрыемствах, у калгасах, установах праводзяць вялікую агітацыйна-прапагандысцкую работу па вывучэнню новага выбарчага закона—дзецішча Сталінскай Канстытуцыі.

Работнікі літаратуры і мастацтва, перадавыя прадстаўнікі совецкай інтэлігенцыі, павінны паказаць у гэтых адносінах узоры сваёй работы, дапамагчы мастацкім словам вывучаць сталінскі выбарчы закон, актыўна ўключыцца ў выбарчую кампанію.

Толькі нязначная частка пісьменнікаў адгукнулася сваімі творамі аб выбарчай кампаніі. На тэму выбараў напісана некалькі вершаў. Ні адзін з пісьменнікаў не падумаў аб тым, каб напісаць для сцэны, для эстрады інсцэніроўку, інтэрмедыю, араторыю. Пісьменнікі не маюць яшчэ цеснай сувязі з масамі. За апошні час амаль ніхто з пісьменнікаў не выязджаў у творчыя камандыроўкі ў калгасы, у вёскі, на будаўніцтва.

12 снежня ўпершыню прыдуць да выбарчых урнаў мільёны маладых патрыётаў совецкай зямлі—аднагодкаў Кастрычніка. Гэта—выбаршчыкі, якія выхаваны нашай краінай нашай комуністычнай партыяй, якія не ведаюць цяжару царскага рэжыма, якім не давялося жыць пры капіталістычнай палачнай выбарчай сістэме.

Задача совецкага пісьменніка—паказаць мастацкім словам равеснікам Кастрычніка, маладым выбаршчыкам, усю жудасць царскіх законаў, жудасць нікалаеўскай «канстытуцыі», паказаць, як у кастрычніку 1917 года народ са зброяй у руках змагаўся пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі за тыя вялікія правы, што зараз запісаны ў Сталінскай Канстытуцыі. Якая вялікая, пачэсная і адказная тэма для кожнага совецкага пісьменніка!


Пісьменнікі вывучаюць Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет Саюза ССР. Мясцком саюза, партыйная і комсамольская арганізацыі абмінулі тут важную галіну работы—прапаганду выбарчага закона сярод жонак пісьменнікаў. У гэтым напрамку няма ніякай работы. «...Трэба ўзмацніць агітацыю і прапаганду сярод шырокіх жаночых мас... Кожная грамадзянка Совецкага Саюза павінна ведаць велічэзныя дасягненні сваёй радзімы. Не павінна быць ні аднаго кутка ў нашай неабсяжнай краіне, дзе-б жанчына не вывучала вялікую Сталінскую Канстытуцыю» (*«Правда»*).

Оргкамітэт саюза мастакоў не ўзначаліў работы па прапагандзе выбарчага закона—плакатам, яркім малюнкам, не ўзначаліў работы па мастацкаму афармленню клубаў і іншых памяшканняў, дзе адбудуцца сходы выбаршчыкаў. Мастакі ігнаруюць работу над плакатам, над афішай да выбараў.

Тое-ж самае мы маем на нашай беларускай эстрадзе і ў тэатрах. Работнікі эстрады і тэатраў яшчэ не ўключыліся як след у выбарчую кампанію.

Упраўленне па справах мастацтваў і ЦП саюза работнікаў мастацтваў скліваюць многа розных нарад і пасяджэнняў. Але не было ні аднаго схода па пытанню ўдзелу работнікаў мастацтваў у выбарчай кампаніі. Выходзіць, што і кіруючыя органы абмінулі гэту справу.

Гэтымі днямі адкрываецца выстаўка паказу дасягненняў эканомікі і соцыялістычнай культуры Совецкай Беларусі, у якой удзельнічаюць работнікі мастацкага фронта. Пажадана, каб сярод шматлікіх экспанатаў наведвальнікі выстаўкі пабачылі экспанаты, якія паказваюць работу совецкіх пісьменнікаў, мастакоў, актораў па прапагандзе выбарчага закона і вялікай Сталінскай Канстытуцыі. У выбарчай кампаніі, ўсім мастацкім сілам рэспублікі патрэбна інтэнсіўна папрацаваць.



МАСКВА, КРЭМЛЬ,

ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

Мы, рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя горада Менска, сабраўшыся для абмеркавання і вылучэння кандыдатур у Вярхоўны Совет СССР, аднадушна рашылі вылучыць Вас, дарагі таварыш Сталін, першым нашым кандыдатам у дэпутаты ад Менскай гарадской выбарчай акругі ў Совет Саюза.

Кожны партыйны і непартыйны большэвік, кожны совецкі патрыёт, абмяркоўваючы ў гэтыя дні кандыдатуры ў Вярхоўны Совет СССР, першыя свае мыслі, першыя свае словы звяртае да Вас, называе Вас, дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, першым сваім дэпутатам, Вас, які разам з Леніным арганізоўваў, загартоўваў і песціў нашу слаўную большэвіцкую партыю, хто разам з Леніным вёў працоўны народ на пераможны штурм капіталізма ў кастрычніцкія дні, хто ў жорсткіх непрымірымых баях з ворагамі народа адстаяў чыстату ленінскага вучэння і, развіваючы далей вялікае вучэнне Маркса — Энгельса — Леніна, прывёў нас да канчатковай, беспаваротнай перамогі соцыялізма і вядзе шчаслівую краіну Советаў да комунізма.

Пад Вашым мудрым вадзіцельствам, дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, разбіты і знішчаны трацкісцка-бухарынскія гады, прэзрэнныя найміты фашысцкіх ахранак, якія імкнуліся кінуць нас у пекла капіталістычнага рабства. Вам, дарагі настаўнік і друг, абавязаны мы шчаслівым і радасным жыццём. Вы забяспечылі ператварэнне нашай радзімы з жабрацкай, адсталай краіны ў магутную, непераможную дзяржаву, крэпасць сусветнай рэволюцыі. Вы з'яўляецеся тварцом самай дэмакратычнай у свеце вялікай Канстытуцыі—хартыі вольнасцей свабодных народаў Совецкага Саюза.

Вялікая любоў беларускага народа да Вас, свайго лепшага друга, тварца беларускай дзяржаўнасці. Ленінска-сталінская нацыянальная палітыка адрадзіла да жыцця шматлікія народы неабсяжнай краіны Советаў, забяспечыла ўздым і росквіт нацыянальных па форме, соцыялістычных па зместу культур.

Пад вашым геніяльным кіраўніцтвам Совецкая Беларусь з адсталай, прыгнечанай калоніі царызма, якую вякамі прыгняталі рускія і польскія памешчыкі і капіталісты, ператварылася ў квітнеючую індустрыяльна-калгасную рэспубліку—магутны фарпост на заходніх рубяжах Совецкага Саюза. Беларускі народ ніколі не забудзе велізарнай дапамогі, аказанай яму па Вашых непасрэдных указаннях, па Вашай, дарагі таварыш Сталін, ініцыятыве ў ліквідацыі шкодніцтва польскіх шпіёнаў.

Мы просім Вас, дарагі таварыш Сталін, даць сваю згоду балатыравацца ў Совет Саюза ад Менскай гарадской выбарчай акругі.

Няхай жыве першы кандыдат совецкага народа ў дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР вялікі правадыр народаў, наш родны таварыш Сталін!

ПА ДАРУЧЭННЮ АГУЛЬНЫХ СХОДАЎ РАБОЧЫХ, ІНЖЫНЕРНА-ТЭХНІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ І СЛУЖАЧЫХ ПІСЬМО ПАДПІСАЛІ:

Лоскат — завод імя Варашылава, **Ахрэмчык** — завод імя Кірава, **Левін** — фабрыка «Кастрычнік», **Коган** — фабрыка «КІМ», **Каралёў** — мясакамбінат, **Шымановіч** — кандзіцерская фабрыка «Комунарка», **Ляпешка** — завод імя Молатава, **Вярхоўскі**—друкарня імя Сталіна, **Праліч** — вагоннае дэпо, **Скроцкі** — паравознае дэпо, **Гургоўнік** — фабрыка імя Куйбышава, **Пятроўская** — фабрыка «Чырвоны тэкстыльшчык», **Г. Скабло** — фабрыка імя Кагановіча, **Паўлаў** — цагельны завод № 1, **Антаненка** — Акадэмія Навук БССР, **Цоер** — Белдзяржуніверсітэт, **Рамашкоў** — Медінстытут, **Шаршнёў** — Юрыдычны інстытут, **Шэйнгауз** — камбінат сувязі, праф. **Мац** — Клінічны гарадок.

Ад байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Менскага гарнізона пісьмо падпісалі: Свірыдаў, Егораў, Кавалёў, Алееў, Кірылаў, Машкоў, Ткачэнка, Ліджыеў, Букарэнка, Камкоў, Іваноў, Курбатаў, Шыдлоўскі, Мядзведзеў, Манухін, Кураў.

МАСКВА,

НАРОДНАМУ КАМІСАРУ АБАРОНЫ СССР

ТАВАРЫШУ ВАРАШЫЛАВУ

Мы, рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя горада Менска, сабраўшыся для абмеркавання і вылучэння кандыдатур у Вярхоўны Совет СССР, аднадушна рашылі вылучыць Вас, дарагі таварыш Варашылаў, кандыдатам у дэпутаты ад Менскай гарадской выбарчай акругі ў Совет Саюза.

Вы, дарагі таварыш Варашылаў, родны і блізкі сэрцу кожнага партыйнага і непартыйнага большэвіка, сэрцу кожнага патрыёта нашай соцыялістычнай радзімы.

Мы Вас ведаем і горача любім, як бліжэйшага вернага саратніка Леніна і Сталіна, як бясстрашнага, непахіснага большэвіка-пролетарыя, прысвяціўшага ўсё сваё жыццё, усе свае сілы і нястомную энергію беззаветнай барацьбе за справу рабочага класа, за шчасце і радасць народаў СССР, за вялікую справу Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна.

Мы ведаем Вас, дарагі таварыш Варашылаў, як бліжэйшага і вернага друга нашага любімага правадыра, бацькі і настаўніка, роднага таварыша Сталіна, разам з якім Вы, таварыш Варашылаў, на ўсіх этапах барацьбы за соцыялізм [illegible] змагаліся за выкананне запаветаў [illegible] паказваючы ўсім нам узоры большэвіцкай непрымірымасці і бязлітаснасці ў барацьбе і разгроме ворагаў народа.

Ваша слаўнае імя вядома кожнаму з нас, як імя жалезнага палкаводца нашай роднай, любімай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, якая пад Вашым кіраўніцтвам расла, загартоўвалася і стала самай магутнай, самай моцнай у свеце арміяй, здольнай у любую мінуту сакрушальна разграміць ворага на той тэрыторыі, адкуль ён прыдзе, калі ён паспрабуе парушыць свяшчэнныя граніцы Совецкай зямлі.

Мы ведаем Вас, родны наш Клімецій Ефрэмавіч,—як лепшага, блізкага друга беларускага народа. Мы ведаем, як у годы грамадзянскай вайны Вы ў першых радах рускага рабочага класа, узначальваючы жалезныя палкі Чырвонай Арміі, дапамаглі беларускаму народу ачысціць сваю зямлю ад крывавых германскіх і польскіх акупантаў, памешчыкаў і капіталістаў.

Мы ведаем Вашу нястомную работу па ўмацаванню Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі—баявога фарпоста Совецкага Саюза на заходніх граніцах і Вашы нястомныя клопаты аб росце і росквіце шчаслівага беларускага народа.

Мы просім Вас, дарагі таварыш Варашылаў, даць сваю згоду балатыравацца [illegible] Совет Саюза Вярхоўнага [illegible] гарадской выбарчай акругі і абяцаем Вам апраўдаць Ваша давер'е далейшай беззаветнай барацьбой за справу Леніна—Сталіна, за новыя перамогі комунізма.

ПА ДАРУЧЭННЮ АГУЛЬНЫХ СХОДАЎ РАБОЧЫХ, ІНЖЫНЕРНА-ТЭХНІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ І СЛУЖАЧЫХ ПІСЬМО ПАДПІСАЛІ:

Лоскат — завод імя Варашылава, **Ахрэмчык**—завод імя Кірава, **Меламед**—швейная фабрыка «Кастрычнік», **Коган**—швейная фабрыка «КІМ», **Шостак**—мясакамбінат, **Шапіра**—кандзіцерская фабрыка «Комунарка», **Ляпешка**—завод імя Молатава, **Вярхоўскі**—друкарня імя Сталіна, **Праліч**—вагоннае дэпо, **Скроцкі**—паравознае дэпо, **Гамер**—фабрыка імя Куйбышева, **Пятроўская** — фабрыка «Чырвоны тэкстыльшчык», **Г. Скабло** — фабрыка імя Кагановіча, **Паўлаў** — цагельны завод № 1, **Антаненка** — Акадэмія Навук БССР, **Цоер** — Белдзяржуніверсітэт, **Шаршнёў** — Юрыдычны інстытут, **Шэйнгауз**—камбінат сувязі, праф. **Мелкіх**—Клінічны гарадок, **Рамашкоў** Медінстытут.

Ад байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Менскага гарнізона пісьмо падпісалі: Свірыдаў, Егораў, Кавалёў, Алееў, Кірылаў, Машкоў, Ткачэнка, Ліджыеў, Букарэнка, Камкоў, Іваноў, Курбатаў, Шыдлоўскі, Мядзведзеў, Манухін, Кураў.

Першыя кандыдаты БССР

22 кастрычніка на менскіх прадпрыемствах—на заводзе «Большэвік», фабрыцы «8 сакавіка», на заводах «Ударнік», імя Варашылава, імя Мяснікова, імя Кірава, імя Молатава, на фабрыках імя КІМ, імя Кагановіча, на электрастанцыі і інш., у ваенных часцях і ўстановах—БДУ, Палітэхнічным інстытуце і інш.—адбыліся перадвыбарчыя сходы. Рабочыя, служачыя, чырвонаармейцы, камначпалітсклад, студэнты і выкладчыкі прадэманстравалі сваю адданасць і любоў сваім правадырам—любімаму таварышу І. В. Сталіну і першаму маршалу СССР К. Е. Варашылаву, аднагалосна вылучыўшы іх першымі кандыдамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Саюза.

Рабочыя, чырвонаармейцы, служачыя выказвалі свае лепшыя думкі аб слаўных сынах соцыялістычнай радзімы.

— Я пражыў 61 год,—гаворыць рабочы фабрыкі імя КІМ т. Марголін.—Свае лепшыя маладыя годы я згубіў у цяжкой, непасільнай працы. Радасці не бачыў. Подлыя эксплаататары абыходзіліся са мной, як з жывёлінай, шкадавалі кавалак хлеба, а затое на падзатыльнікі і пінкі былі вельмі шчодрымі. Але ўсё гэта прайшло. Зараз я найшчаслівейшы чалавек у свеце. Выпесціў дзесяцера дзяцей. Маю 6 зяцёў, 3 нявесткі, 23 унукі. Сям'я ўся складаецца з 43 чалавек. Усе жывуць радасна і шчасліва. І сёння з вялікай гордасцю мае дзеці аддаюць свае галасы тым, хто стварыў для іх светлае прыгожае жыццё.

Я, стары рабочы, прапаную выбраць кандыдатам у Вярхоўны Совет СССР нашага правадыра таварыша Сталіна, тварца Канстытуцыі соцыялізма, які вядзе нас ад перамогі да перамогі.

— Бацька мой,—гаворыць чырвонаармеец Калчанаў,—доўгі час быў батраком, а з 1910 г. ён працуе на чыгуначным транспарце. У мінулым ён атрымліваў 17 руб. 50 к. Зразумела, што жылося яму ў сям'і вельмі цяжка. А вось зараз ён брыгадзір службы пуці, зарабляе 350 руб. у месяц і жыве ў поўным дастатку і радасці.

— У Сталінскай Канстытуцыі запісана, што совецкая дзяржава забяспечвае ўсім грамадзянам СССР права на адпачынак. І гэтым правам працоўныя шырока карыстаюцца ў нас. Дзякуй партыі і ўраду, дзякуй вялікаму Сталіну за наша заможнае жыццё.

Раздаюцца гучныя авацыі па адрасу пасланнікаў народа, выразіцеляў народнай волі і народных імкненняў таварышоў Сталіна і Варашылава.

Служачы менскай электрастанцыі тав. Хамяноў, выражаючы думку рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічнага персаналу, сказаў:

— Я прапаную першым кандыдатам у Вярхоўны Совет СССР вылучыць таго, хто поплеч з Владзімірам Ільічом Леніным рыхтаваў і зваў рабочы клас і сялянства на барацьбу за сваё вызваленне;

— хто разам з Леніным перамог на фронтах грамадзянскай вайны і даў працоўным Совецкай Расіі сваю сапраўдную радзіму;

— хто на працягу дваццаці год горда вёў краіну ад перамогі да перамогі, да светлага соцыялізма;

— хто бязлітасна граміў усіх і ўсякіх ворагаў народа: трацкісцка-зіноўеўска-бухарынскіх выродкаў, прэзрэнных бандытаў, агентаў фашызма;

— хто даў народам неабсяжнага Совецкага Саюза сёнешняе шчаслівае, багатае жыццё;

— хто з'явіўся творцам вялікіх правоў совецкага грамадзяніна, запісаных залатымі літарамі ў вялікай Сталінскай Канстытуцыі;

— пад чыім непасрэдным кіраўніцтвам авангард працоўных усяго свету—вялікі Совецкі Саюз—пабудаваў выдатны будынак соцыялізма;

— хто з'яўляецца найвялікшым геніем, лепшым чалавекам нашай эпохі, правадыром усяго прыгнечанага чалавецтва,—а імя яму—СТАЛІН!

На ўсіх сходах аднагалосна пастанавілі: прасіць дарагіх таварышоў Сталіна і Варашылава, каб яны далі згоду балатыравацца на выбарах у Совет Саюза па Менскай выбарчай акрузе.

25 кастрычніка рабочыя інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя віцебскіх і гомельскіх прадпрыемстваў аднадушна вызначылі ў дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР правадыра Совецкага Саюза і вялікага друга працоўных БССР таварыша Сталіна, сталінскіх наркомаў таварышоў Варашылава, Кагановіча і Ежова і прадстаўнікоў беларускага народа т. Волкава—часова вык[illegible]ага абавязкі сакратара ЦК К[illegible] т. Багачову—стаханаўку [illegible] дзільнай фабрыкі імя Каган[illegible]

Дваццацігоддзе гістарычнага пасяджэння ЦК партыі большэвікоў

Пісьмо членам ЦК

Таварышы!

Я пішу гэтыя радкі вечарам 24-га, становішча данельга крытычнае. Ясней яснага, што цяпер, ужо сапраўды, прамаруджанне ў паўстанні смерці падобна.

З усіх сіл пераконваю таварышоў, што цяпер усё вісіць на валаску, што на чарзе стаяць пытанні, якія не нарадамі вырашаюцца, не з'ездамі (хоць-бы нават з'ездамі Советаў), а выключна народамі, масай, барацьбой узброеных мас.

Буржуазны націск карнілаўцаў, удаленне Вярхоўскага паказвае, што чакаць нельга. Трэба, ва што-б там ні было, сягоння вечарам, сягоння ноччу арыштаваць урад, абяззброіўшы (перамогшы, калі будуць супраціўляцца) юнкераў і т. д.

Нельга чакаць!! Можна страціць усё!!

Цана ўзяцця ўлады зараз: абарона НАРОДА (не з'езда, а народа, арміі і сялян у першую галаву) ад Карнілаўскага ўрада, які прагнаў Вярхоўскага і саставіў другую Карнілаўскую змову.

Хто павінен узяць уладу?

Гэта зараз не важна: няхай яе возьме Ваенна-Рэволюцыйны Камітэт «ці іншая ўстанова», якая заявіць, што здасць уладу толькі сапраўдным прадстаўнікам інтарэсаў народа, інтарэсаў арміі (прапанова міру зараз), інтарэсаў сялян (зямлю ўзяць патрэбна зараз, адмяніць прыватную ўласнасць), інтарэсаў галодных.

Трэба, каб усе раёны, усе палкі, усе сілы мабілізаваліся зараз і паслалі неадкладна дэлегацыі ў Ваенна-Рэволюцыйны Камітэт, у Ц. К. большэвікоў, настойліва патрабуючы: ні ў якім разе не пакідаць улады ў руках Керэнскага і кампаніі да 25-га, ніякім чынам; вырашаць справу сягоння абавязкова вечарам ці ноччу.

Гісторыя не даруе прамаруджання рэволюцыянерам, якія маглі перамагчы сягоння (і напэўна перамогуць сягоння), рызыкуючы траціць многа заўтра, рызыкуючы страціць усё.

Узяўшы ўладу сягоння, мы бяром яе не супроць Советаў, а для іх.

Узяцце ўлады ёсць справа паўстання; яго палітычная мэта выясніцца пасля ўзяцця.

Было-б гібеллю ці фармальнасцю чакаць хістальнага галасавання 25 кастрычніка, народ мае права і абавязан вырашаць падобныя пытанні не галасаваннямі, а сілай; народ мае права і абавязан у крытычныя моманты рэволюцыі накіроўваць сваіх прадстаўнікоў, нават сваіх лепшых прадстаўнікоў, а не чакаць іх.

Гэта давяла гісторыя ўсіх рэволюцый, і бязмерным было-б злачынства рэволюцыянераў, калі-б яны выпусцілі момант, ведаючы, што ад іх залежыць РАТУНАК РЭВОЛЮЦЫІ, прапанова, міру, ратунак Піцера, ратунак ад голаду, перадача зямлі сялянам.

Урад хістаецца. Трэба ДАБІЦЬ яго, ва што-б там ні было!

Прамаруджанне ў выступленні смерці падобна.

Напісана 6 лістапада [24 кастрычніка] 1917 г. [В. І. Ленін. Творы, т. XXI, стар. 362—363].

І. В. СТАЛІН

Улада Советаў

У першыя дні рэволюцыі лозунг «уся ўлада Советам» быў навінкай. У красавіку «ўлада Советаў» упершыню процістаўляецца ўладзе Часовага Ўрада. Большасць у сталіцы пакуль яшчэ за Часовы Ўрад без Мілюкова—Гучкова. У чэрвені гэты лозунг атрымлівае дэманстрацыйнае прызнанне вялізнай большасці рабочых і салдат. Часовы Ўрад ужо ізаляваны ў сталіцы. У ліпені вакол лозунга «ўся ўлада Советам» успыхвае барацьба паміж рэволюцыйнай большасцю сталіцы і ўрадам Львова—Керэнскага. Згодніцкі Ц. В. К., апіраючыся на адсталасць правінцыі, пераходзіць на бок урада. Барацьба вырашаецца на карысць урада. Прыхільнікі совецкай улады абвяшчаюцца па-за законам. Настае мёртвая паласа «соцыялістычных» рэпрэсій і «рэспубліканскіх» турмаў, банапартысцкіх падседжванняў і ваенных змоў, расстрэлаў на фронце і «нарад» у тыле. Гэта да жніўня. У канцы жніўня карціна рэзка змяняецца. Карнілаўскае паўстанне выклікае напружанне ўсіх сіл рэволюцыі. Советы ў тыле і камітэты на фронце, памёршыя было ў ліпені—жніўні, цяпер «раптам» ажываюць. І, ажыўшы, бяруць уладу ў свае рукі ў Сібіры і на Каўказе, у Фінляндыі і на Украіне, у Одэсе і Харкаве. Без гэтага, без узяцця ўлады, рэволюцыя была-б разгромлена. Так «улада Советаў», абвешчаная ў красавіку «маленькай групай» большэвікоў у Піцеры, у канцы жніўня атрымлівае амаль усеагульнае прызнанне рэволюцыйных класаў у Расіі.

Цяпер ясна для ўсіх, што «ўлада Советаў» не толькі папулярны лозунг, але і адзіна верны сродак у барацьбе за перамогу рэволюцыі, адзіны выхад са становішча, што стварылася.

Настаў момант, калі лозунг «уся ўлада Советам» павінен быць, нарэшце, ператворан у жыццё.

Апе што такое «улада Советаў» і чым яна адрозніваецца ад усякай іншай улады?

Гавораць, што перадаць уладу Советам, гэта значыць саставіць «аднароднае» дэмакратычнае міністэрства, арганізаваць новы «кабінет» з «соцыялістычных» міністраў і, наогул, зрабіць «сур'ёзнае змяненне» ў асабовым складзе Часовага Ўрада. Апе гэта няверна. Справа тут зусім не ў замене адных асоб Часовага Ўрада другімі. Справа ў тым, каб гаспадарамі становішча ў краіне сталі новыя, рэволюцыйныя класы. Справа ў пераходзе ўлады ў рукі пролетарыята і рэволюцыйнага сялянства. Але для гэтага і перамена аднаго толькі ўрада далёка яшчэ недастаткова. Для гэтага неабходна перш за ўсё правесці карэнную чыстку ва ўсіх ведамствах і ўстановах урада, выгнаўшы адусюль карнілаўцаў, паставіўшы ўсюды адданых людей рабочага класа і сялянства. Толькі тады і толькі ў такім выпадку можна будзе гаварыць аб пераходзе [illegible] ады да Советаў «у цэнтры і на

Чым вытлумачыць вядомую ўсім бездапаможнасць «соцыялістычных» міністраў Часовага Ўрада? Чым вытлумачыць той факт, што гэтыя міністры аказаліся нікчэмнымі цацкамі ў руках людзей, якія стаяць па-за Часовым Урадам (успомніце «даклады» Чарнова і Скобелева, Заруднага і Пешахонава на «Дэмакратычнай нарадзе»!)? Перш за ўсё, тым, што не яны вялі свае ведамствы, а ведамствы вялі іх. Тым, між іншым, што кожнае ведамства з'яўляецца крэпасцю, дзе да гэтага часу яшчэ сядзяць бюракраты царскага перыяду, якія ператвараюць добрыя пажаданні міністраў у «гук пусты», гатовы сабатаваць любое рэволюцыйнае мерапрыемства ўлады. Каб улада перайшла да Советаў не на словах толькі, але і на справе, неабходна ўзяць гэтыя крэпасці і, выгнаўшы адтуль слуг кадэцка-царскага рэжыма, паставіць на іх месца выбарных і змяняемых, адданых справе рэволюцыі работнікаў.

Улада Советам—гэта значыць карэнная чыстка ўсіх і ўсякіх урадавых устаноў у тыле і на фронце, знізу даверху. Улада Советам—гэта значыць выбарнасць і змяняемасць усіх і ўсякіх «начальнікаў» у тыле і на фронце.

Улада Советам—гэта значыць выбарнасць і змяняемасць «прадстаўнікоў улады» у горадзе і вёсцы, у арміі і флоце, у «ведамствах» і «устанаўленнях», на чыгунках і ў паштова-тэлеграфных установах.

Улада Советам—гэта значыць дыктатура пролетарыята і рэволюцыйнага сялянства.

Дыктатура гэта ў корані адрозніваецца ад дыктатуры імперыялісцкай буржуазіі, той самай, якую не так даўно стараліся ўстанавіць Карнілаў і Мілюкоў пры прыхільным удзеле Керэнскага і Тэрэшчанкі.

Дыктатура пролетарыята і рэволюцыйнага сялянства,—г. зн. дыктатура працоўнай большасці над эксплаатуючай меншасцю, над памешчыкамі і капіталістамі, над спекулянтамі і банкірамі, у імя дэмакратычнага МІРУ, у імя рабочага КАНТРОЛЮ над вытворчасцю і размеркаваннем, у імя ЗЯМЛІ для сялян, у імя ХЛЕБА для народа.

Дыктатура пролетарыята і рэволюцыйнага сялянства,—г. зн. дыктатура, адкрытая, масавая, ажыццяўляемая на вачах усіх без змовы і закуліснай работы. Бо такой дыктатуры няма чаго скрываць, што лакаутчыкам-капіталістам, якія абвастраюць беспрацоўе шляхам розных «разгрузак», і банкірам-спекулянтам, якія ўзвінчваюць цэны на прадукты і ствараюць голад,—літасці не будзе.

Дыктатура пролетарыята і сялянства,—г. зн. дыктатура без гвалту над масамі, дыктатура воляю мас, дыктатура для абуздання волі ворагаў гэтых мас.

Такая класавая сутнасць лозунга «ўся ўлада Советам».

Падзеі ўнутранай і замежнай палітыкі, зацяжная вайна і прага міру, паражэнні на фронце і абарона сталіцы, гніласць Часовага Ўрада і «пераезд» у Маскву, разруха і голад, беспрацоўе і знясіленне,—усё гэта нястрымана цягне рэволюцыйныя класы Расіі да ўлады. Гэта значыць: краіна ўжо выспела для дыктатуры пролетарыята і рэволюцыйнага сялянства.

Настаў момант, калі рэволюцыйны лозунг «уся ўлада Советам» павінен быць, нарэшце, ажыццёўлен.

[«Рабочий Путь» № 35, 26(13) кастрычніка 1917 года].

АБ СКЛАДЗЕ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ПА ВЫБАРАХ У СОВЕТ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Беларускай ССР

На падставе арт. 37, 38 і 39 „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР", Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР **пастанаўляе:**

Зацвердзіць склад рэспубліканскай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей ад БССР у складзе наступных прадстаўнікоў ад грамадскіх арганізацый:

Старшыня—ГРЭК Надзежда Грыгор'еўна—ад Цэнтральнага праўлення прафесіянальнага саюза швейнікаў.

Нам. старшыні—ВАНЕЕЎ Владзімір Грыгор'евіч—ад Цэнтральнага праўлення прафесіянальнага саюза работнікаў дзяржаўных устаноў.

Сакратар—БЕЛЯЕЎ Спірыдон Маркавіч—ад Цэнтральнага праўлення прафесіянальнага саюза работнікаў палітасветустаноў.

Члены: МАЦВЕЕЎ Аляксандр Паўлавіч—ад комуністычнай арганізацыі гор. Менска.

ЕЛАГІН Серафім Нікалаевіч—ад Цэнтральнага Камітэта ЛКСМ Беларусі.

ЦІХАНАЎ Аляксандр Пятровіч—ад рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых завода імя Кірава ў гор. Менску.

СПАСАЎ Пётр Сяргеевіч—ад Цэнтральнага Совета Асоавіяхіма БССР.

ГЛУШКО Фёдар Савіч—ад калгаснікаў калгаса „Большэвік", Петрыкаўскага раёна.

АНТОНАВА Анна Сямёнаўна—ад рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых Віцебскай акулярнай фабрыкі.

КАРБАНОВІЧ Павел Феліцыянавіч—ад рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых завода імя Варашылава ў гор. Менску.

КАЧУРА Іван Міхайлавіч—ад Цэнтральнага праўлення прафесіянальнага саюза работнікаў вышэйшай школы і навукова-даследчых устаноў гор. Менска.

КУРГАН Ісак Маркавіч—ад комуністычнай арганізацыі гор. Гомеля.

ПАПСУЕВА Наталья Нікіфараўна—ад Цэнтральнага камітэта прафесіянальнага саюза рабочых фанернай і запалкавай прамысловасці.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. СТАКУН.

ЧВА сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЕРМАК.

21 кастрычніка 1937 г.
г. Менск.

М. Грубіян

Дванаццатага снежня

Не будзе са слязмі народ яўрэйскі
У баку стаяць,
Як калісьці з вачыма ўпалымі,
У сэрцы без надзей,
Калі дванаццатага снежаня
Мы будзем выбіраць
У свой урад сыноў сваіх,
Сваіх адданейшых людзей.

Няма больш цёмных вуліц тых,
Што для мяне былі,
Дзе я не бачыў радасці,
бачыў сонца свет.
роўнапраўны сын

Іду з народамі зямлі
Я выбіраць у родны наш,
Вярхоўны наш Совет.

І выбяру я Сталіна,
Любімага і роднага свайго,
Што к шчасцю мне
Пуці шырокія праклаў.
Цякла рака крыві калісьці
Ля вакна майго,
Цяпер цячэ рака празрыстага
Дзівоснага святла.

Вольны пераклад з яўрэйскай мовы Міх. КАЛАЧЫНСКАГА.

А. Гурло

МОЙ ГОЛАС

Я сёння песняй галасую,
Да урны жар душы нясу,
Жыцця адчуўшы ўсю красу,
За лепшых з лепшых галасую.
Я сам шчаслівейшы з шчаслівых.
Таму мой голас—волі дар—
Табе аддам я, гаспадар
Совецкіх фабрык, шляхаў, ніваў.
Закон твой поспехаў скарбніца,
Далейшы росквіт нашых дзён.
А для мяне, паэта, ён
Яшчэ і творчая крыніца.
Я чэрпаць буду ў ёй натхненне
Для гукаў, думак, пачуцця,
Настрой для песень і жыцця
Мне даў вялікі, мудры геній.
Ён расчыніў мне шыр і далі,
Яго люблю, яго пяю,
Яму жар сэрца аддаю.
Мой гэты геній—родны Сталін!

АБ ЗАЦВЕРДЖАННІ СКЛАДУ АКРУГОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ ПА ВЫБАРАХ У СОВЕТ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР

На падставе арт. арт. 45, 46, 47 „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР" Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ: зацвердзіць акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей у складзе наступных прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных:

51. Полацкая акруговая выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ — Снегаў Фядот Пракоф'евіч—ад комуністычнай арганізацыі Полацкага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Лякомцаў Пётр Максімавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў медсанпрацы Полацкай акругі.

САКРАТАР—Зайцаў Анатолій Пятровіч—ад калгаснікаў калгаса «VII з'езд Советаў», Бігосаўскага сельскага совета, Дрысенскага раёна.

ЧЛЕНЫ: Шаўцоў Васілій Грыгор'евіч—ад калгаснікаў калгаса «Авангард», Сенькоўскага сельскага совета, Асвейскага раёна.

Чубчанка Ігнацій Васільевіч—ад калгаснікаў калгаса «Расоны», Расонскага раёна.

Лосеў Міхаіл Міхайлавіч—ад калгаснікаў калгаса «XVII з'езд партыі», Замшанскага сельскага совета, Полацкага раёна.

Пілюшэнка Сямён Леонавіч—ад калгаснікаў калгаса «Паграхнічны маяк», Кушлікоўскага сельскага совета, Полацкага раёна.

Сабаленка Елена Ільінічна—ад калгаснікаў калгаса «Чырвоная Сосніца», Сосніцкага сельскага совета, Полацкага раёна.

Масарская Маня Вульфаўна—ад работнікаў промарцелі «XVII гадавіна Кастрычніка» горада Полацка.

Новікава Матрона Кузьмінічна—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы Полацкага раёна.

Газман Марыя Бенцыянаўна—ад комсамольскай арганізацыі Дрысенскага раёна.

52. Віцебская акруговая гарадская выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ — Васількоўскі Кузьма Прохаравіч—ад профсаюзнай арганізацыі чыгуначнага вузла станцыі Віцебск, Заходняй чыгункі.

НАМ. СТАРШЫНІ—Хайлоў Міхаіл Фёдаравіч—ад комуністычнай арганізацыі Лёзнянскага раёна.

САКРАТАР—Пірацінская Шэйна-Рэйза Беркаўна—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы горада Віцебска.

ЧЛЕНЫ: Паліцан Іван Станіслававіч ад рабочых, ІТР і служачых паравознага дэпо станцыі Віцебск.

Захараў Іван Антонавіч—ад рабочых, ІТР і служачых ільнапрадзільнай фабрыкі імя Кагановіча горада Віцебска.

Сцежкін Пётр Іосіфавіч—ад рабочых, ІТР і служачых 10 дыстанцыі пуці Заходняй чыгункі, станцыя Віцебск.

Смародзінскі Шмуіл Янкелевіч—ад рабочых, ІТР і служачых швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», горад Віцебск.

Паўлаў Сяргей Філатавіч—ад комуністычнай арганізацыі горада Віцебска.

Залатухін Аляксей Фаміч—ад работнікаў шклозавода «Ноўка», Суражскага раёна.

Сапега Аляксей Осіпавіч—ад калгаснікаў калгаса «Інтэрнацыянал», Сутоцкага сельскага совета Лёзнянскага раёна.

Юшкевіч Пётр Міхайлавіч—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Лёзнянскага раёна.

53. Віцебская акруговая сельская выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Жылянін Якім Аляксандравіч—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Віцебскага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Генін Лейзар Нісонавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў дзяржустаноў Гарадоцкага раёна.

САКРАТАР—Эльберт Сямён Менашэнікаў машынна-трактарных станцый Віцебскага раёна.

ЧЛЕНЫ: Еленскі Дамінік Вікенцевіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў машына-трактарных станцый Віцебскага раёна.

Іванова Фядора Іванаўна—ад калгаснікаў калгаса «Пабеда», Віцебскага раёна.

Зубрыцкая Елена Фёдараўна—ад калгаснікаў калгаса імя Кірава, Мехаўскага раёна.

Ісаеў Філіп Сямёнавіч—ад комуністычнай арганізацыі Віцебскага раёна.

Азаркевіч Мендэль Вульфавіч—ад комуністычнай арганізацыі Сіроцінскага раёна.

Урзвіч Ілья Сямёнавіч—ад рабочых, ІТР і служачых Янавіцкага вінзавода і працоўных мястэчка Янавічы, Суражскага раёна.

Пашкоўская Анна Барысаўна—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў медсанпрацы, Віцебскага раёна.

Разумаў Васілій Сцяпанавіч—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Сіроцінскага раёна.

54. Лепельская акруговая выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ — Барадзін Аляксандр Фёдаравіч—ад комуністычнай арганізацыі Лепельскай акругі.

НАМ. СТАРШЫНІ—Ледзенеў Васілій Васільевіч—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Лепельскага раёна.

САКРАТАР—Рашчынскі Павел Мефодзьевіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў Шосбуда Ушдор-709.

ЧЛЕНЫ: Шакіраў Софа Шакіравіч—ад арганізацыі Асоавіяхіма Лепельскай акругі.

Мінін Нікалай Нікіфаравіч—ад комуністычнай арганізацыі Лепельскага раёна.

Качанава Ефрасіня Сцяпанаўна—ад рабочых, ІТР і служачых 2-й Лепельскай МТС.

Урбан Аляксей Фядосавіч—ад профсаюзнай арганізацыі кааператыўных работнікаў Лепельскага раёна.

Плісно Егор Матвеевіч—ад комсамольскай арганізацыі Лепельскай акругі.

Грамакоўскі Владзімір Фаміч—ад рабочых, ІТР і служачых папяровай фабрыкі «Чырвоная звязда», Чашніцкага раёна.

Клейман Залман-Нісон Рувімавіч—ад рабочых будаўнікоў 57 участка.

Крыскевіч Кірыл Філіпавіч—ад рабочых, ІТР і служачых Ушацкай машынна-трактарнай станцыі.

55. Аршанская акруговая гарадская выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Шакуцін Фёдар Іванавіч—ад арганізацыі Асоавіяхіма Аршанскага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Мараходаў Аляксей Андрэевіч—ад рабочых, ІТР і служачых станцыі Орша—Цэнтральная.

САКРАТАР—Калеснікаў Нікалай Міронавіч—ад рабочых, ІТР і служачых механічнага завода—«Чырвоны барэц», горад Орша.

ЧЛЕНЫ: Баскін Грыгорый Саламонавіч ад рабочых, ІТР і служачых ільнакамбіната, горад Орша.

Гаршуноў Данііл Філіпавіч—ад профсаюзнай арганізацыі 4-га аддз. Заходняй чыгункі, горад Орша.

Мацюк Пётр Лук'янавіч—ад рабочых, ІТР і служачых Белдрэса.

Дашук Валянціна Аляксееўна — ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы Аршанскага раёна.

Базілевіч Ефім Нікіціч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў дзяржустаноў Аршанскага раёна.

Ражковіч Агаф'я Ефрэмаўна—ад калгаснікаў калгаса імя Косарава, Сенненскага раёна.

Паус Канстанцін Сямёнавіч—ад калгаснікаў калгаса «Совецкая Беларусь», Падворыцкага сельсовета, Сенненскага раёна.

Зайцаў Фама Іванавіч—ад калгаснікаў калгаса «Перамога», Талачынскага сельскага совета, Талачынскага раёна.

56. Аршанская акруговая сельская выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Чарнякоў Арон Алтаравіч—ад рабочых, ІТР і служачых мясакамбіната, горад Орша.

НАМ. СТАРШЫНІ—Ламадзе Грыгорый Міхайлавіч—ад рабочых, ІТР і служачых хлебакамбіната, горад Орша.

САКРАТАР—Росін Міхаіл Владзіміравіч—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Аршанскага раёна.

ЧЛЕНЫ: Кедрава Аляксандра Аляксееўна—ад калгаснікаў калгаса імя Карла Маркса, Гальцэўскага сельскага совета, Аршанскага раёна.

Лосеў Павел Анціпавіч—ад комсамольскай арганізацыі Аршанскага раёна.

Кандрыкіна Зінаіда Георгіеўна—ад рабочых, ІТР і служачых Аршанскай машынна-трактарнай станцыі.

Крутаўцоў Міна Карпавіч—ад калгаснікаў калгаса «Пролетарый», Пішчалаўскага сельскага совета, Аршанскага раёна.

Максіменка Сямён Савельевіч — ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў дзяржустаноў Дубровенскага раёна.

Шумейка Сяргей Ціханавіч—ад рабочых, ІТР і служачых «Дняпроўскай мануфактуры», Дубровенскага раёна.

Камарава Маланья Кандрацеўна—ад комсамольскай арганізацыі Багушэўскага раёна.

Півуноў Філіп Мітрафанавіч—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Круглянскага раёна.

57. Барысаўская акруговая гарадская выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ — Небышынец Васілій Іванавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў дзяржустаноў горада Барысава.

НАМ. СТАРШЫНІ—Хурсік Захар Захаравіч—ад комуністычнай арганізацыі Плешчаніцкага раёна.

САКРАТАР—Пугач Афанасій Львовіч—ад комуністычнай арганізацыі горада Барысава.

ЧЛЕНЫ: Жалкевіч Фядора Іванаўна—ад рабочых, ІТР і служачых запалкавай фабрыкі імя Кірава горада Барысава.

Сінгатулін Файвула Тэкфатуліновіч—ад рабочых, ІТР і служачых фанернага завода № 21 горада Барысава.

Кацнельсон Міхаіл Лазаравіч—ад комсамольскай арганізацыі Барысаўскага раёна.

Егараў Нікалай Нікалаевіч—ад арганізацыі Асоавіяхіма Барысаўскага раёна.

Панцялей Грыгорый Нікалаевіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы Барысаўскага раёна.

Петушкоў Нікалай Спірыдонавіч—ад калгаснікаў калгаса «Луч Леніна», Халопеніцкага раёна.

Міклашэўская Софья Юльянаўна—ад комсамольскай арганізацыі Лагойскага раёна.

Гракова Марыя Аляксандраўна—ад калгаснікаў калгаса «Паліталдзелец», Плешчаніцкага раёна.

58. Барысаўская акруговая сельская выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ — Каўтуненка Сцяпан Паўлавіч—ад рабочых, ІТР і служачых шклозавода імя Дзержынскага, Барысаўскага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Камагораў Пётр Егоравіч—ад комуністычнай арганізацыі Барысаўскага раёна.

САКРАТАР—Тарасаў Аляксандр Іванавіч—ад арганізацыі Асоавіяхіма Барысаўскага раёна.

ЧЛЕНЫ: Касяновіч Аляксандра Дзмітрыеўна—ад калгаснікаў калгаса імя Комінтэрна, Барысаўскага раёна.

Панцялей Грыгорый Нікалаевіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы Барысаўскага раёна.

Фрыдман Груня Майсееўна—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў дрэвапрацоўчай прамысловасці Барысаўскага раёна.

Кулінская Міхаліна Міхайлаўна—ад рабочых, ІТР і служачых запалкавай фабрыкі імя Кірава, Барысаўскага раёна.

Кірычэнка Егор Елісеевіч—ад рабочых, ІТР і служачых лесазавода імя Молатава горада Барысава.

Бікман Арон Лейбавіч—ад комуністычнай арганізацыі Смалявіцкага раёна.

Якаўлева Марфа Сысоеўна—ад калгаснікаў калгаса «Чырвоны Май», Крупскага раёна.

Копышаў Іван Нікалаевіч—ад комсамольскай арганізацыі Барысаўскага раёна.

59. Горацкая акруговая выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Барсукоў Іван Паўлавіч—ад комуністычнай арганізацыі Горацкага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Багданаў Аркадзій Васільевіч—ад комсамольскай арганізацыі Горацкага раёна.

САКРАТАР—Росін Гдаля Абрамавіч—ад профсаюзнай арганізацыі зямельных работнікаў Сельскагаспадарчага інстытута, горад Горкі.

ЧЛЕНЫ: Захараў Сяргей Сцяпанавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў вышэйшай школы Беларускага Сельскагаспадарчага інстытута, горад Горкі.

Кайкоў Канстанцін Зіноўевіч—ад чыгуначнікаў станцыі Крычаў.

Дарашэнка Нікалай Сямёнавіч—ад рабочых, ІТР і служачых цэментнага завода мястэчка Крычава.

Кухарава Марыя Аляксееўна—ад калгаснікаў калгаса «Ленінскі прызыў», Дрыбінскага раёна.

Пахоменка Іван Емельянавіч — ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ, Дрыбінскага раёна.

Нікалаеў Владзімір Трафімавіч—ад калгаснікаў калгаса «Новае жыццё», Мсціслаўскага раёна.

Лютко Філіп Нікалаевіч—ад калгаснікаў калгаса «Шлях да соцыялізма», Горацкага раёна.

Маеў Фёдар Сямёнавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы Мсціслаўскага раёна.

60. Магілеўская акруговая гарадская выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Сагал Якаў-Хаім Гіршавіч—ад комуністычнай арганізацыі горада Магілева.

НАМ. СТАРШЫНІ—Эткала Антон Мітрафанавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў грамадскага харчавання горада Магілева.

САКРАТАР—Лісоўскі Пётр Іванавіч—ад рабочых, ІТР і служачых шоўкавай фабрыкі горада Магілева.

ЧЛЕНЫ: Кавалёва Еўдакія Іванаўна—ад рабочых, ІТР і служачых швейнай фабрыкі імя Валадарскага горада Магілева.

Рыманава Екацярына Васільеўна—ад комсамольскай арганізацыі горада Магілева.

Кавалёў Дзяніс Якаўлевіч—ад рабочых, ІТР і служачых трубаліцейнага завода горада Магілева.

Зайцаў Нікалай Нікалаевіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў чыгункі Магілеўскага вузла.

Курас Ілья Сямёнавіч—ад комуністычнай арганізацыі Шклоўскага раёна.

Лукашоў Навум Сільвестравіч—ад рабочых, ІТР і служачых папяровай фабрыкі «Спартак», Шклоўскага раёна.

Марозаў Леон Васільевіч—ад калгаснікаў калгаса «Х З'езд Советаў», Бялыніцкага раёна.

Чэрняк Іосіф Рувімавіч—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Бялыніцкага раёна.

61. Магілеўская акруговая сельская выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Кандратовіч Аляксандр Іванавіч—ад профсаюзнай арганізацыі фінбанкаўскіх работнікаў Магілеўскага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Беляков Міхаіл Пятровіч ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў горада Магілева.

САКРАТАР—Тярэнцьеў Павел Епіфанавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы Магілеўскага раёна.

ЧЛЕНЫ: Аўтухоў Павел Андрэевіч—ад рабочых, ІТР і служачых Лупалаўскай машына-трактарнай станцыі, Магілеўскага раёна.

Тарасаў Пракофій Пракоф'евіч—ад рабочых, ІТР, і служачых соўгаса «Восход», Магілеўскага раёна.

Данілаў Ахрэм Сямёнавіч—ад калгаснікаў калгаса «Аграном», Ржаўскага сельскага совета, Прапойскага раёна.

Луферава Варвара Ермалаеўна—ад работнікаў канатна-вяровачнай арцелі, Прапойскага раёна.

Логашаў Антон Сафонавіч—ад калгаснікаў калгаса «Ударнік палёў», Асінаўскага сельскага совета, Чавускага раёна.

Корнева Фёкла Клімаўна—ад калгаснікаў калгаса імя Дзержынскага, Хацьковіцкага сельсовета, Чавускага раёна.

Судзілоўскі Фёдар Іванавіч—ад комсамольскай арганізацыі Чэрыкаўскага раёна.

Антонаў Максім Пятровіч—ад калгаснікаў калгаса «Другая пяцігодка», Чэрыкаўскага раёна.

62. Клімавіцкая акруговая выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Марозаў Павел Самуілавіч—ад арганізацыі Асоавіяхіма Клімавіцкага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Варанцова Ульяна Грыгор'еўна—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў дзяржустаноў Хоцімскага раёна.

САКРАТАР—Шчэдаў Фёдар Трафімавіч—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Клімавіцкага раёна.

ЧЛЕНЫ: Заіс Марыя Іосіфаўна—ад комсамольскай арганізацыі Клімавіцкага раёна.

Паўлічэнка Павел Макеевіч—ад рабочых, ІТР і служачых Клімавіцкай машынна-трактарнай станцыі.

Самахвалаў Аксенцій Лазаравіч—ад калгаснікаў калгаса «Новы шлях», Тросценскага сельскага совета, Хоцімскага раёна.

Свірко Ірына Маркаўна—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы Чырвонапольскага раёна.

Савіцкі Фёдар Іванавіч—ад рабочых, ІТР і служачых соўгаса імя Калініна, Чырвонапольскага раёна.

Брыскер Юда Ізраілевіч—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Касцюковіцкага раёна.

Максіменка Аляксандр Пятровіч—ад калгаснікаў калгаса імя Сталіна, Дзержынскага сельсовета, Касцюковіцкага раёна.

Майсеенка Анастасія Фядотаўна—ад калгаснікаў калгаса імя Сталіна, Рікаўскага сельскага совета, Касцюковіцкага раёна.

63. Быхаўская акруговая выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Гаўрыленка Сямён Васільевіч—ад комуністычнай арганізацыі Быхаўскага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Цыганаў [illegible] Прохаравіч—ад профсаюзнай [illegible] цыі работнікаў лесу і сплав[illegible] скага раёна.

(Працяг на 3 ст[illegible]

АБ ЗАЦВЕРДЖАННІ СКЛАДУ АКРУГОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ ПА ВЫБАРАХ У СОВЕТ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР

(Працяг)

САКРАТАР—Коўцеў Марк Філіпавіч—ад калгаснікаў калгаса «Пролетарская рэспубліка», Быхаўскага раёна.

ЧЛЕНЫ: Яцкевіч Іван Антонавіч—ад комсамольскай арганізацыі Быхаўскага раёна.

Рудкоўская Анна Антонаўна—ад рабочых, ІТР і служачых шклозавода «Ільіч», Быхаўскага раёна.

Лукашэвіч Аляксандр Ефімавіч—ад арганізацыі Асоавіяхіма Быхаўскага раёна.

Дзівачэнка Самуіл Паўлавіч—ад комуністычнай арганізацыі Журавіцкага раёна.

Малазаеў Барыс Аляксеевіч—ад комуністычнай арганізацыі Кіраўскага раёна.

Кажамякін Фёдар Дамітрыевіч—ад калгаснікаў калгаса «Свабода», Карманскага раёна.

Шунько Адам Кірылавіч—ад комсамольскай арганізацыі Клічаўскага раёна.

Важнік Владзімір Сцяпанавіч—ад калгаснікаў калгаса «Новы мір», Карманскага раёна.

64. Асіпавіцкая акруговая выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Шпакова Ольга Пятроўна—ад комуністычнай арганізацыі Асіпавіцкага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Селівонін Нікалай Міхайлавіч—ад кааператыўных работнікаў Асіпавіцкага раёна.

САКРАТАР—Падліпскі Майсей Гершанавіч—ад комуністычнай арганізацыі Чэрвеньскага раёна.

ЧЛЕНЫ: Бяляева Марыя Васільеўна—ад комсамольскай арганізацыі Асіпавіцкага раёна.

Сокалаў Васілій Еўдакімавіч—ад рабочых, ІТР і служачых паравознага дэпо станцыі Асіпавічы.

Азерын Іван Карлавіч—ад рабочых, ІТР і служачых соўгасаў «Індустрыя» і «Магучы», Пухавіцкага раёна.

Місялевіч Павел Афанасьевіч—ад калгаснікаў калгаса «Чэлюскінец», Чэрвеньскага раёна.

Рысавец Максім Іосіфавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў дзяржустаноў Смілавіцкага раёна.

Гарэлік Лейба Іосіфавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы Смілавіцкага раёна.

Загароўская Марыя Аляксандраўна—ад калгаснікаў калгаса «Авангард», Зборскага сельсовета, Асіпавіцкага раёна.

Лысянкова Ульяна Ануфрыеўна—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Пухавіцкага раёна.

65. Менская акруговая гарадская выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Васільеў Георгій Андрыянавіч—ад комуністычнай арганізацыі горада Менска.

НАМ. СТАРШЫНІ—Кацовіч Іосіф Невахавіч—ад рабочых, ІТР і служачых завода імя Кірава горада Менска.

САКРАТАР—Анціпенка Ніна Ігнацеўна—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы горада Менска.

ЧЛЕНЫ: Клябан Нікалай Аляксандравіч—ад рабочых, ІТР і служачых завода імя Варашылава горада Менска.

Лепешка Аркадзій Валер'янавіч—ад рабочых, ІТР і служачых завода імя Молатава горада Менска.

Ліберман Хаім Самуілавіч—ад комсамольскай арганізацыі Варашылаўскага раёна.

Пятроўская Марыя Сцяпанаўна—ад рабочых, ІТР і служачых фабрыкі «Чырвоны тэкстыльшчык» горада Менска.

Кац Тайба Ёселеўна—ад рабочых, ІТР і служачых фабрыкі імя Кагановіча горада Менска.

Крывашчокава Марыя Васільеўна—ад рабочых, ІТР і служачых фабрыкі «Акцябр» горада Менска.

Мінкін Залман Хонавіч—ад рабочых ІТР і служачых завода «Большэвік».

Язвін Ізраіль Эльявіч—ад арганізацыі Асоавіяхіма горада Менска.

66. Менская акруговая сельская выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Мальцэў Сяргей Іванавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў дзяржустаноў Менскага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Шчарбовіч Станіслаў Іосіфавіч—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Менскага раёна.

САКРАТАР—Патапаў Міхаіл Васільевіч—ад калгаснікаў калгаса імя Карла Маркса, Трасцянецкага сельскага совета, Менскага раёна.

ЧЛЕНЫ: Бабкін Нікалай Нікалаевіч—ад комуністычнай арганізацыі Менскага раёна.

Шынкевіч Іван Казіміравіч—ад калгаснікаў калгаса «Красный специалист», Менскага раёна.

Бердынаў Владзімір Паўлавіч—ад комсамольскай арганізацыі Менскага раёна.

Грынцэвіч Васілій Якаўлевіч—ад калгаснікаў калгаса «Звязда», Заслаўскага раёна.

Седляронак Леанід Грыгор'евіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы Менскага раёна.

Бабовіч Анэта Вікенцеўна—ад калгаснікаў калгаса «Пятилетка», Заслаўскага раёна.

Бляхман-Гарохава Браніслава Львоўна—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў медсанпрацы Менскага раёна.

Коршак Іосіф Лук'янавіч—ад калгаснікаў калгаса «Красный партизан», Менскага раёна.

67. Слуцкая акруговая гарадская выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Эзрын Барыс Абрамавіч—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Слуцкага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Мохунь Андрэй Васільевіч—ад комсамольскай арганізацыі Слуцкага раёна.

САКРАТАР — Казлоўскі Владзімір Паўлавіч—ад рабочых, ІТР і служачых млына «Прагрэс», Слуцкага раёна.

ЧЛЕНЫ: Рабаў Міхаіл Акімавіч—ад арганізацыі Асоавіяхіма Старадарожскага раёна.

Трэцьякоў Павел Антонавіч—ад комуністычнай арганізацыі Любаньскага раёна.

Рымашэўскі Владзімір Іванавіч—ад калгаснікаў калгаса «Казбек», Глускага раёна.

Шэўчук Сяргей Савельевіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы Старобінскага раёна.

Гамановіч Раман Сямёнавіч—ад комуністычнай арганізацыі горада Слуцка.

Лейбовіч Файвель Ёселевіч—ад работнікаў промарцелі імя Молатава горада Слуцка.

Ароніна Анна Цэзараўна—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы горада Слуцка.

Жукавец Васілій Захаравіч—ад калгаснікаў калгаса «Герой труда», Старадарожскага раёна.

68. Слуцкая акруговая сельская выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Ігаеў Сямён Сцяпанавіч—ад комуністычнай арганізацыі Слуцкай акругі.

НАМ. СТАРШЫНІ—Папоў Філіп Іосіфавіч—ад арганізацыі Асоавіяхіма Слуцкага раёна.

САКРАТАР—Глазкоў Сяргей Андрэевіч—ад комуністычнай арганізацыі Капыльскага раёна.

ЧЛЕНЫ: Крэмез Марыя Грыгор'еўна—ад рабочых, ІТР і служачых Узденскай машынна-трактарнай станцыі.

Бяляй Максім Савіч—ад калгаснікаў калгаса «Чырвоны вартаўнік», Чырванаслабодскага раёна.

Вапуда Пётр Трафімавіч—ад комуністычнай арганізацыі Слуцкага раёна.

Сінельнікаў Сямён Юдэлевіч—ад рабочых, ІТР і служачых электрастанцыі горада Слуцка.

Самцоў Грыгорый Іванавіч—ад комсамольскай арганізацыі Слуцкай акругі.

Тыцёнак Феадосій Якаўлевіч—ад комуністычнай арганізацыі Грэскага раёна.

Юрчэня Пелагея Фёдараўна—ад калгаснікаў калгаса імя Тіміразева, Капыльскага раёна.

Злачэўскі Гаўрыіл Якаўлевіч—ад арганізацыі Асоавіяхіма Капыльскага раёна.

69. Бабруйская акруговая выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Гладышаў Ефрэм Іванавіч—ад комуністычнай арганізацыі Бабруйскага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Леман Грыгорый Флегантавіч—ад арганізацыі Асоавіяхіма Бабруйскага раёна.

САКРАТАР—Болцікаў Павел Іванавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў адміністрацыйных устаноў горада Бабруйска.

ЧЛЕНЫ: Іларыёнаў Аляксей Аляксеевіч—ад рабочых, ІТР і служачых завода № 16 горада Бабруйска.

Салановіч Варвара Андрэеўна—ад рабочых, ІТР і служачых швейнай фабрыкі імя Дзержынскага горада Бабруйска.

Каровін Іван Сямёнавіч—ад рабочых, ІТР і служачых завода імя Сталіна горада Бабруйска.

Прахарэнка Ульяна Янкаўна—ад калгаснікаў калгаса «Чырвоны баец» № 2, Туркоўскага сельскага совета, Бабруйскага раёна.

Вендраў Мейлах Геўсеевіч—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Парыцкага раёна.

Лёгкі Кузьма Сцяпанавіч—ад калгаснікаў калгаса «Совецкая Беларусь», Раманецкага сельскага совета, Парыцкага раёна.

Бурнейка Леонцій Сямёнавіч—ад комуністычнай арганізацыі Парыцкага раёна.

Паласавец Нікіта Еўменавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы Кіраўскага раёна.

70. Жлобінская акруговая выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Гутнер Юда Давідавіч ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Буда-Кашалеўскага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Калунтаеў Іван Грыгор'евіч—ад комуністычнай арганізацыі Жлобінскага раёна.

САКРАТАР—Емельянаў Нікіта Карпавіч—ад рабочых, ІТР і служачых Буда-Кашалеўскай МТС.

ЧЛЕНЫ: Яшчэнка Іван Гаўрылавіч—ад рабочых, ІТР і служачых станцыі Жлобін.

Пíхнэ Міхаіл Аронавіч—ад комсамольскай арганізацыі Жлобінскага раёна.

Прыбыльскі Максім Кірылавіч—ад рабочых, ІТР і служачых лесазавода імя Халтурына, Рагачоўскага раёна.

Царанкоў Міна Герасімавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы Рагачоўскага раёна.

Казлова Пелагея Фёдараўна—ад калгаснікаў калгаса імя Дзержынскага, Любовінскага сельскага совета, Буда-Кашалеўскага раёна.

Васільеў Іван Еўгеневіч—ад комуністычнай арганізацыі Рагачоўскага раёна.

Рыўкін Ізраіль Залманавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў чыгункі станцыі Буда-Кашалева.

Патроннікаў Мітрафан Афанасевіч—ад арганізацыі Асоавіяхіма Жлобінскага раёна.

71. Мазырская акруговая гарадская выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Сухадольская Еўгенія Іванаўна—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Даманавіцкага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Масалкоў Міхаіл Ефімавіч—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Мазырскага раёна.

САКРАТАР—Амелькін Іван Фёдаравіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў дзяржустаноў Мазырскага раёна.

ЧЛЕНЫ: Лобан Аляксандр Сцяпанавіч—ад калгаснікаў калгаса «Чырвоны сцяг», Валоцкага сельскага совета, Хойніцкага раёна.

Грыгаровіч Сцяпан Вікенцевіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў дзяржустаноў Хойніцкага раёна.

Сапавей Іван Кузьміч—ад рабочых, ІТР і служачых Даманавіцкай машынна-трактарнай станцыі.

Гілевіч Анна Філіпаўна—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы Мазырскага раёна.

Плішчанка Павел Ануфрыевіч—ад комсамольскай арганізацыі Мазырскага раёна.

Баравік Васілій Іванавіч—ад рабочых, ІТР і служачых службы руху станцыі Калінкавічы.

Стрыжакурка Фёдар Анісімавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў лесу і сплаву Нараўлянскага раёна.

Смолікаў Пётр Аляксеевіч—ад рабочых, ІТР і служачых Жыткавіцкага камбіната.

72. Мазырская акруговая сельская выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Ваўчкоў Еўціхій Кірылавіч—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў Лельчыцкага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Шпак Антон Іларыёнавіч—ад работнікаў промкааператыўных арцелей горада Калінкавічы.

САКРАТАР—Лучыновіч Пётр Андрэевіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў дзяржустаноў Капаткевіцкага раёна.

ЧЛЕНЫ: Іваноў Філіп Іванавіч—ад рабочых, ІТР і служачых Жыткавіцкай машынна-трактарнай станцыі.

Хільман Анісім Міхайлавіч—ад калгаснікаў калгаса «Комінтэрн», Жыткавіцкага раёна.

Мерман Эстэр Лазараўна—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў медсанпрацы Ельскага раёна.

Казлоўская Надзежда Васільеўна—ад рабочых, ІТР і служачых цукеркавай фабрыкі «Чырвоны мазыранін», Нараўлянскага раёна.

Беленчык Аляксандр Міхайлавіч—ад комуністычнай арганізацыі Тураўскага раёна.

Міхайлоўскі Хаім Юдэлевіч—ад рабочых, ІТР і служачых лесазавода «Змычка», Капаткевіцкага раёна.

Жураўлевіч Анна Міхайлаўна—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў медсанпрацы Петрыкаўскага раёна.

Бурштэйн Моўша Шмеркавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў зямельных органаў Лельчыцкага раёна.

73. Рэчыцкая акруговая выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Ражкоў Георгій К...авіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў дзяржустаноў Рэчыцкага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Кураўскі Янкель Шэвелевіч—ад комуністычнай арганізацыі Рэчыцкага раёна.

САКРАТАР—Чарнаглаз Зуся Якаўлевіч—ад комуністычнай арганізацыі Камарынскага раёна.

ЧЛЕНЫ: Абрамовіч Павел Антонавіч—ад работнікаў промкааператыўных арцелей Рэчыцкага раёна.

Лісаковіч Іван Якаўлевіч—ад палітасветработнікаў Брагінскага раёна.

Грань Елізавета Васільеўна—ад калгаснікаў калгаса «Дняпроўская комуна», Лоеўскага раёна.

Цырульнікаў Лейба Залманавіч—ад рабочых, ІТР і служачых лесазавода імя Кірава горада Рэчыцы.

Дзейкун Іван Львовіч—ад работнікаў машынна-трактарнай станцыі Рэчыцкага раёна.

Тімашэнка Андрэй Андрэевіч—ад рабочых, ІТР і служачых скуранага завода імя Варашылава горада Рэчыцы.

Тіханава Пелагея Іванаўна—ад калгаснікаў калгаса «Палеская праўда», Лоеўскага раёна.

Пушкін Аляксей Васільевіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы Рэчыцкага раёна.

74. Гомельская акруговая гарадская выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Громаў Аляксей Сяргеевіч—ад комуністычнай арганізацыі горада Гомеля.

НАМ. СТАРШЫНІ—Калуноў Аляксей Ільіч—ад рабочых, ІТР і служачых паравознага дэпо станцыі Гомель.

САКРАТАР—Кучынскі Нікалай Іванавіч—ад профсаюзнай арганізацыі палітасветработнікаў горада Гомеля.

ЧЛЕНЫ: Палянічка Васілій Нікіціч—ад рабочых, ІТР і служачых Упраўлення Беларускай чыгункі.

Дубкоў Фёдар Аляксеевіч—ад рабочых, ІТР і служачых фабрыкі «Полеспечать» горада Гомеля.

Дарогаўцаў Аляксандр Владзіміравіч—ад комсамольскай арганізацыі Беларускай чыгункі.

Казлова Фрума Шэпшэлеўна—ад рабочых, ІТР і служачых фабрыкі «Комінтэрн» горада Гомеля.

Левант Майсей Зелікавіч—ад рабочых, ІТР і служачых фабрыкі «Труд» горада Гомеля.

Паіна Вера Самуйлаўна—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў пачатковай і сярэдняй школы горада Гомеля.

Груша Іван Іванавіч—ад рабочых, ІТР і служачых машынабудаўнічага завода «Двигатель революции» горада Гомеля.

Бепянькоў Харытон Анісімавіч—ад калгаснікаў калгаса «Новый путь» Крупіцкага сельскага совета, Добрушскага раёна.

75. Гомельская акруговая сельская выбарчая камісія

СТАРШЫНЯ—Штэйнбах Грыгорый Абрамавіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў дзяржустаноў Гомельскага раёна.

НАМ. СТАРШЫНІ—Ветлугін Антон Фёдаравіч—ад комуністычнай арганізацыі Гомельскага раёна.

САКРАТАР—Руткоўскі Афанасій Антонавіч—ад комуністычнай арганізацыі Уваравіцкага раёна.

ЧЛЕНЫ:—Ляўданская Марыя Іванаўна—ад комсамольскай арганізацыі Гомельскага раёна.

Сяргееў Іван Пятровіч—ад профсаюзнай арганізацыі работнікаў дзяржгандлю Гомельскага раёна.

Казлоў Іосіф Васільевіч—ад рабочых, ІТР і служачых Нова-Беліцкага дрэваапрацоўчага камбіната.

Лапацін Антон Іванавіч—ад арганізацыі Асоавіяхіма Гомельскага раёна.

Новікаў Сямён Нікалаевіч—ад рабочых, ІТР і служачых Упраўлення Беларускай чыгункі.

Сапаўёва Анна Ермалаеўна—ад калгаснікаў калгаса «Х з'езд Советаў БССР», Веткаўскага раёна.


Мельнікава Зінаіда Сцяпанаўна—ад калгаснікаў калгаса «Пролетарый», Чэчэрскага раёна.

Новікава Надзежда Якаўлеўна—ад рабочых, ІТР і служачых завода «Спартак» горада Гомеля.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. СТАКУН

ЧВА сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЕРМАК

21 кастрычніка 1937 г. г. Менск



Да 20 гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі ў Менску заканчваецца будаўніцтва Тэатра оперы і балета.

На здымку—злева направа: агульны выгляд тэатра, файе (праект).

Фота І. Каплінскага.

ШОТА РУСТАВЕЛІ

„Віцязь у тыгравай скуры“

Раздзел пяты

1. Сказ Тарыэла Аўтандзілу аб сваіх ліхіх прыгодах

Выслухай апавяданне ты увагаю прыкуты,
Калі буду ў сілах словам муку выказаць сваю.
Ведаю, не дасць збавення тая, ад якой пакуты
І аб кім штодня бязмерна і тужу і слёзы ллю.
Там дзе Інд цячэ бурлівы сем уладанняў за гарамі
З іх шасцьмі кіруе мудра, мужны Парсадан адзін.
Смелы, шчодры і багаты уладар над уладарамі
Сілай—леў, а тварам—сонца і граза усіх краін.
Паважаны, слаўны бацька сёмым горда уладарыў,
Сарадан, адважны ў бойках, быў за ўсіх мацнейшым ён.
Ў потай ці на полі бойкі, хто-б нанёс яму удары?
Паляваць любіў ён, гульні і не ведаў сумных дзён.
Бацька мой благаславёны паспытаў цяжар улады
І сказаў тады: «Дакучна ваяваць і пакараць.
Угамован люты вораг, што рыхтуе вечна здраду.
Падуладным Парсадану будзе мне не крыўдна стаць».
І ў сталіцу к Парсадану адаслаў з ганцом пасланне,
У пасланні напісаўшы Індастана ўладару:
«Падуладным тваім звацца—даўняе маё жаданне,
Я хачу слугою верным быць свайму гаспадару».
Парадан сказаў вясёлы: «Ў гэты дзень зрабіце свята»
Пасылайце Сарадану: «я уславіць творца рад.
І за вартае рашэнне, што табой было прынята
Прыязджай у двор, сустрэну я цябе як друг ці брат».
І за ім пакінуў царства, ў чын узвёўшы амбірбара,
Бацька мой служыў васалам пад канец старэчых дзён.
Ала роўным быў з царом ён. Меўшы годнасць спасалара

Кіраваў магутным войскам, слаўным быў, як і здавён.
Ганарыўся спасаларам цар сваім слугой адданым,
Хто ліхім варожым рацям у баю страшней чумы.
Ён бязлітасны к мяцежным, вераломным, неслухмяным.
Хоць зусім і непадобны, усё-ж друг друга вартымі мы.
У цара па волі неба не было дзяцей жаданых.
Разам з вернымі вайскамі сумаваў да горкіх слёз.
Царскі зрок мяне прыкмеціў: «Будзеш сынам мне каханым»
А ці мог тады прадбачыць, што аплачу я свой лёс.
Быццам дарагога сына, Пардасан расціў і песціў,
Як наследніку прастола выхаванне мне даваў.
Мудрацы мяне вучылі ўладаром сябе як весці,
І ўзросшы стаў адважны, тварам—сонца, з сілай льва.
О, Астмат! Скажу няпраўду, спыніш воклічам:—даволі!
Юнаком я стаў. Як ружа дыхаў свежасцю мой твар.
Што няма ў царыцы сына, пазабыў шчаслівы цар.
Мне было тады забаўна ў жорсткай бойцы тыгра здолець,
Прыгадаць цяпер ты можаш, як цвіла краса былая.
Так жа быў чароўней сонца, як ясней за ночы дзень.
Мне зайздросцілі паўсюду: «Статны як таполя рая».
Што з красы твае сляпучай засталося?—Толькі цень.
Хлапчанём я быў не кемкім, ў дні калі злягла царыца...
Віцязь вымавіў з уздыхам: нарадзілася ў цара...
І ўпаў, яго ў прытомнасць прывяла вада з крыніцы,
Прадаўжаў: «...дачка як сонца, незабыўная зара.
Слоў не маю каб узнесці новароджанай хваленне!
І наш цар пачаў ад шчасця з сваёй світай піраваць
Каралі дары прывезлі ўсяму свету на здзіўленне.
І адарываў багата уладар сяброў і раць.
Пры двары раслі мы разам, сума горкага не зналі,
І царэўна зацемняла светазорную зару.
Цар Індзійскі і царыца нас за роўных прызначалі.
Час імя прызнаць каханай, чым полымем гару.
Тарыэля блякнуць вочы бы ахутаныя цьмою
Аўтандзіл пад ім схіліўся з болем плача у бядзе.
Тарыэля аджывілі зноў крынічнаю вадою
І ён вымавіў ледзь чутна: «Пэўна, смерць мая ідзе».
Дарэджан-Нестан—такое ёй імя славутай далі.
У яе—сямігадовай розум промня быў святлей.
Яна мерылася з сонцам. Зоры ёй зайздросціць сталі
І забыць ніхто не ў моцы дзіўны бляск яе вачэй.
Дзеўчына царэўнай стала, я ўзмацнеў для сечы браннай.
І дачцы на трон правы ўсе перадаць ўладар рашыў.
І да бацькі я звярнуўся з дазвалення Парсадана
У меч гуляў я на дзіўленне, верным вечам льва разіў.
Безоаравую вежу па загаду Парсадана
Збудавалі. Ў ёй рубіны палымнелі, як агні.
Сад разбілі. Ў ім журчэлі каляровыя фантаны.
Там праводзіла дзяўчына ў бясклапотных марах дні.
Дзень і ноч з кадзільняў веяў водыр дымкаю густою.
І Нестан сядзела ў вежы, ці ішла ў раскошны сад.
І Давар—сястры царовай, што была каджа ўдавою
Навучаць дачку навукам даручыў дзяржаўны брат.
І ў пакоях аксамітам і парчою зацянёных
Расцвітала Дарэджана, як нябёс вясенніх дар,
Прыпадобіўшыся станам гнуткай пальме габаона
І гулялі з ёй у косці дзве рабыніі Давар.
Мне пятнаццаць год мінула. Парсадану быў я любы
Спаць не адпушчаў да дому—днём заўсёды быў са мной.
Сілай—леў, а тварам сонца, статнасць пальмы, моцнасць дуба,
Ў дні спаборніцтваў за спрытнасць мяне цешылі хвальбой.
Працінаў звяраў і птахаў, верны лук на іх наводзіў,
На майдане ў жвавых гульнях ўсіх я спрытнасцю дзівіў.
І хаця у вясёлым коле вольны час я свой праводзіў,
Думамі заўжды прыкуты да Нестан цудоўнай быў.
І тады бяда спасцігла, агарнула злая кара:
Бацька мой памёр, дапіўшы келіх дзён сваіх да дна.
Ворагі узлікавалі—рады смерці спасалара,
Верныя цару рыдалі ад зідна і да відна.
Цэлы год людзей не бачыў, быў самотны і суровы.
Наракаў усё на неба, ліўні слёз праліў тады.
І прышлі за мной вазіры перадаць царовы словы:
«Тарыэль, мой сын любімы, хопіць чорнай злыбяды».
Роўны нам спачыў навекі, сіраціналі ўсе сталі,
Правадзі дзеству войскам нашым, з гэтых дзён ты амірбар».
Цар жадаў, каб слёзы болей дзён маіх не засмучалі
І, назваўшы палкаводцам, даў ён вотчыну у дар.
Усё-ж пра бацьку успаміны сэрца полымем палілі.
Світа царская з цямноты вывела да промняў дня.
Ўладыры мяне сустрэлі, ўладары мяне хвалілі
І прыймаць з палацу вышлі, цалавалі як радня.
Пасадзіўшы ў троннай зале, ўзняўшы чары за здароўе,
К мужнасці мяне благалі, паважаючы устаў.
Замяніць баяўся бацьку і не слухаў ўладароў я,
Але просьбамі скароны, ганаровы тытул ўзяў.

Раздзел семы

Ліст Нестан-Дарэджаны, пасланы каханаму

Прачытаў ён ліст каханай. На пергаментавым скрутку
Промень пішa залацісты: «Раны скрый, ільвіны брат!
Я твая. Я ненавіджу ўсіх знясіленых ад смутку
Ты мае пазнаеш думкі, як пабачышся з Астмат.
Не дадуць адчай і слёзы закаханым светлай славы.
Лепей подвігам адважным дакажы любоў сваю.
Здраду хітра задумляюць нашы даннікі хатавы—
Пакарай рукою мужнай—подлых здраднікаў ў баю.
Быць супругаю тваёю, што таіць—даўно жадала
Але выказаць прызнанне я дагэтуль не магла.
На тваю пакуту-немач з тайным сумам пазірала.
Не жадаючы, я любай да цябе, мой леў, была.
Слова шчырае паслухай. Не губляй упартасць мужа,
Пакараўшы край хатаваў, ты, вяртайся, як герой.
Не рыдай,—губляе ў лівень ўсе свае пялёсткі ружа.
Я хацела-бы, як сонца увайсці ў твой змрок зарой...»

Пераклалі з рускага тэкста

А. ЗАРЫЦКІ, І. А. УШАКОЎ.

Што затрымлівае сканчэнне будаўніцтва

Яшчэ нядаўна быў рад сур'ёзных перашкод, пагражаючых зрывам адкрыцця Вялікага тэатра да XX гадавіны Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі. Шкоднікі, што пралезлі ў СНК БССР, і галавацяпы з Упраўлення па справах мастацтваў на працягу ўсяго часу будаўніцтва рабілі ўсё, каб адцягнуць тэрмін заканчэння пабудовы.



Саюз совецкіх мастакоў БССР рыхтуецца да выстаўкі «БССР за 20 год».

На здымку: «Плытагон»—скульптура А. І. Жарава.

Фотарэпрадукцыя Шышко (Белсаюзфото)

Зусім нядаўна, у жніўні былы начальнік Упраўлення Ткачэвіч разводзіў «дыскусію» аб мэтазгоднасці механізацыі сцэны, што, моў, «на механізаванай сцэне балерыны будуць ламаць ногі». Ён адхіліў запраектаванае багатае абсталяванне сцэны—мостафермамі, накатнымі пляцоўкамі, тэлескапічнымі пад'ёмнікамі і інш.

Механізацыя сцэны ў свой час была зацверджана Усесаюзным камітэтам па справах мастацтваў. Але самадур Ткачэвіч настаяў на сваім і замяніў абсталяванне па апошняму слову тэхнікі прымітыўным кругам-барабанам. Гэтая акалічнасць прымусіла адмовіцца ад заказаў на абсталяванне сцэны (на якія ўжо выдаткована было 15 тыс. руб.), а машынабудаўнічыя заводы адмовіліся зрабіць барабан. 15 тысяч выкінулі на вецер, а сцэну не механізавалі.

Дарэчы, трэба адзначыць, што кіраўнікі опернага тэатра тт. Ярыкаў і Кладухін таксама не мала наблыталі ў гэтай справе. Запраектаваныя па абодвух баках сцэны «кішэні» з праёмамі на ўсю сваю шырыню (разлічаныя на тое, каб пры дапамозе накатных пляцовак можна было хутка змяніць дэкарацыю), па настаянню кіраўнікоў опернага тэатра адгароджаны чамусьці ад сцэны цаглянымі сценамі.

17 кастрычніка аўтарытэтная камісія Усесаюзнага камітэта па справах мастацтваў адхіліла прапанову кіраўнікоў беларускага опернага тэатра пра адмаўленне ад пабудовы гарызантальнай рамы. Гарызантальная рама з'яўляецца вынаходніцтвам, рэзультатам вялікай даследчай работы ў галіне сцэнічнага абсталявання. У лепшых тэатрах СССР і Еўропы прыстасоўваецца гарызантальная рама, як лепшае дасягненне асвятляючай тэхнікі. Аднак гарызантальная рама так і не ўстанаўліваецца, а балбатня вакол яе значна затрымала работу па электраабсталяванню.

Па сённяшні дзень не вырашана пытанне канструкцыі партала сцэны.

Цяпер змяніліся адносіны да пабудовы Вялікага тэатра. За апошні час ліквідавана шмат перашкод у забеспячэнні будаўніцтва належным абсталяваннем.

Стаханаўцы машынабудаўнічага завода імя тав. Варашылава (Менск) датэрмінова скончылі выраб і ўстаноўку супроцьпажарнай заслоны. Абавязак калектыва варашылаўцаў—своечасова здаць астатні заказ, каб забяспечыць да адкрыцця глядальную залу ацяпленнем.

Гэта павінна паслужыць прыкладам для калектыва завода імя Молатава (Менск), які абавязан як мага хутчэй забяспечыць тэатр мэбляй.

Не гледзячы на тое, што за апошні час колькасць рабочых павялічылася, усё-ж для таго, каб закончыць тэатр у тэрмін неабходна значна больш рабочай сілы. Недастаткова арганізаваны рабочы дзень у падсобных рабочых. Яны часта ходзяць без работы. Яшчэ да гэтага часу не ачышчан участак, што прылягае да тэатра, ад смецця, гліны, цэглы і інш. Прычым, начальнік работ т. Куфман штодня адкладвае гэтыя работы, забываючы на тое, што такі вялікі пляц за два-тры дні нельга ачысціць.

Новае кіраўніцтва менскага горсовета не звaрачае ўвагі на будаўніцтва тэатра, яно толькі абяцае перасяліць жыхароў з прылягаючых дамоў, але да гэтага часу ніякіх мер да гэтага не прыняло. А гэта затрымлівае пракладку ліўнявой каналізацыі.

Не гледзячы на ўсе перашкоды, што маюць месца на будаўніцтве, будаўнікі-стаханаўцы ўсё-ж здолелі перамагчы рад цяжкасцей і поўнасцю выконваюць соцыялістычныя абавязацельствы, узятыя на сябе перад оперным тэатрам. Але ёсць другая пагроза: кіраўнікі тэатра не наладзілі работы свайго калектыва так, каб выканаць узятыя на сябе абавязацельствы, а таксама пагроза, што ў новым памяшканні тэатра не будзе што паказваць у дні святкавання 20-годдзя Кастрычніка.

М. Ходас, С. Касторскі.

В. Вольскі, А. Кучар

Беларуская совецкая літаратура за XX год

II.

Пісьмовая літаратура беларускага народа не мае багатай шматвяковай спадчыны. Апрача царкоўнай літаратуры XV, XVI і XVII стагоддзяў, мы знаходзім параўнаўча невялікую колькасць выдатных твораў свецкай літаратуры толькі ў XIX стагоддзі. К пачатку гэтага стагоддзя адносяцца паэмы невядомых аўтараў «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». «Энеіда навывартa» ствaралася пад уплывам украінскай «Энеіды» Катляроўскага, а «Тарас на Парнасе» з'яўляецца вельмі ўдалай пародыяй на псеўдакласічную літаратуру і яе пісьменнікаў. Аўтар гэтай паэмы быў у курсе літаратурнай барацьбы, што адбывалася ў гэты час, і ўпамінае пра яе ў сваёй паэме, становячыся на бок Пушкіна і Гогаля, супроць Булгарына.

У пачатку XIX стагоддзя на літаратурнай арэне ў Беларусі з'яўляецца пісьменнік Дунін-Марцынкевіч. Ім напісаны паэмы «Гапон», «Шчараўскія дажынкі», опера «Сялянка», а таксама п'есы «Пінская шляхта» і «Залёты». Дунін-Марцынкевіч па сваіх палітычных поглядах быў пісьменнікам-прыгоннікам і многія свае творы падпарадкаваў задачы ўмацавання прыгоннага ладу. Хаця паэмы Дуніна-Марцынкевіча далёка не вызначаюцца фармальнай дасканаласцю, ён не мала зрабіў для развіцця беларускай літаратуры, для ўзбагачэння яе мовы, для пашырэння яе вобразаў.

Значную цікавасць становяць сабою яго п'есы «Пінская шляхта», і «Залёты», напісаныя пад уплывам Мальераўскага «Мешчаніна ў шляхецтве» і востра высмейваючыя дробную шляхту, яе прагавітасць, імкненне да багацця, да грошай.

Куды большае значэнне ў гісторыі беларускай літаратуры мелі пісьменнікі Францішак Багушэвіч і Цётка (Элаіза Пашкевіч). Францішак Багушэвіч выпусціў зборнік вершаў «Дудка беларуская» і «Смык беларускі». У гэтых вершах, у адрозненне ад вершаў Марцынкевіча, адчуваецца паэтычны пафас, страсць. Багушэвіч востра нападае на паноў і памешчыкаў, на царскіх чыноўнікаў і самадзяржаўе. Цётка пайшла яшчэ далей за Багушэвіча. У зборніку «Хрэст на свабоду», што выйшаў у 1905 годзе, яна заяўляе, «што цара павесіць трэба», а ў апавяданні «Прысяга над крывавымі разорамі» даходзіць да выразнага разумення, што толькі саюз Пецярбургскага рабочага, памешчыцкага батрака і салдата дасць беларускаму селяніну зямлю.

Захапленне нацыяналістычнымі ідэямі з боку Багушэвіча, а таксама ўплыў на Цётку буржуазна-нацыяналістычнай партыі Беларускай Соцыялістычнай грамады, членам якой яна была, не далі магчымасці гэтым пісьменнікам стаць на паслядоўна-дэмакратычны шлях у сваёй творчасці.

Такім чынам, сапраўдная гісторыя беларускай літаратуры пачынаецца толькі з выхадам на гістарычную арэну ў 1905 годзе Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Янка Купала і Якуб Колас выступілі ў літаратуры, як прадстаўнікі рэволюцыйна-дэмакратычных мас сялянства. Яны былі ўзняты на хвалях буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі 1905 года і высунулі ў сваёй творчасці тыя патрабаванні, якія высоўвала рэволюцыйнае сялянства.

Яны патрабавалі зямлі і волі для прыгнечаных сялянскіх мас. Працоўныя Беларусі ў гэтыя годы былі прыгнечаны, не толькі соцыяльна, але і нацыянальна. І натуральна, што на першым этапе сваёй творчасці і Янка Купала і Якуб Колас побач з соцыяльнымі патрабаваннямі высоўваюць патрабаванні нацыянальнай самастойнасці для беларусаў, права развіцця літаратуры, культуры, школ на роднай мове. Бацькаўшчына займае ў іх творчасці вялікае месца. Гэта і зразумела. Ленін яшчэ ў 1916 годзе пісаў:

«У заходніх краінах нацыянальны рух—даўняе мінулае. «Бацькаўшчына» у Англіі, Францыі, Германіі і т. д. *ужо* праспявала сваю песню, адыграла сваю гістарычную ролю г. зн. прагрэсіўнага, узнімаючага да новага эканамічнага і палітычнага жыцця новыя масы людзей, тут нацыянальны рух даць не можа. Тут на гістарычнай чарзе дня стаіць не пераход ад феадалізма або ад патрыярхальнай дзікасці да нацыянальнага прагрэса, да культурнай і палітычна вольнай бацькаўшчыны, а пераход ад зжыўшай сябе капіталістычна-пераспелай «бацькаўшчыны» да соцыялізма.

На ўсходзе Еўропы справа стаіць інакш. Для украінцаў і беларусаў, напрыклад, толькі чалавек, які ў марах жыве на Марсе, мог-бы адмаўляць, што тут няма яшчэ завяршэння нацыянальнага руху, што абуджэнне мас да авалодання роднай мовай і яе літаратурай (а гэта неабходная ўмова і спадарожнік поўнага развіцця капіталізма, поўнага пранікнення абмену да апошняй сялянскай сям'і)—тут *яшчэ* адбываецца. «Бацькаўшчына» тут *яшчэ* не праспявала ўсёй сваёй гістарычнай песні. «Абарона бацькаўшчыны» яшчэ можа быць тут абаронай дэмакратыі, роднай мовы, палітычнай свабоды супроць прыгнятаючых нацый, супроць сярэднявечча, тады як англічане, французы, немцы, італьянцы ілгуць цяпер, гаворачы пра абарону сваёй бацькаўшчыны ў данай вайне, бо *не* родную мову, *не* свабоду свайго нацыянальнага развіцця абараняюць яны на справе, а свае рабаўласніцкія правы, свае калоніі, «сферы ўплыву» свайго фінансавага капітала ў чужых краінах і інш.» (Ленін, том XIX, старонкі 204—205).

І Янка Купала і Якуб Колас у годы 1905—1908 заклікаюць беларускае сялянства паўстаць супроць цара і памешчыка, якія смакталі кроў з сялянскіх жыл.

Купала і Колас пішуць у гэтыя годы вершы-пракламацыі, разлічаныя на аратарскі голас і напісаныя ў аратарска-заклікаючым тоне:

Хай кроў пальецца дзень, другі
Варожым трупам на падсціл,
Хай у няволі ланцугі
Спадуць ад грому вашых сіл,—

заклікаў Янка Купала.

І яму ўторыў Якуб Колас:

Я—мужык, а гонар маю,
Гнуся, але да пары.
Я маўчу, маўчу, трываю,
Але скора загукаю:
«Стрэльбы, хлопчыкі, бяры!»

Тэматычна і Янка Купала і Якуб Колас у гэтыя годы непарыўна звязаны з вёскай. Пераважнымі тэмамі іх вершаў з'яўляюцца: голад вясною, цяжар падаткаў, сялянская цемра, доля батрачкі, катаржная праца плытагонаў, град, што пусціў па свету селяніна, і інш.

Апрача палітычнай лірыкі ў годы 1910—13 і Янка Купала і Якуб Колас ствараюць і больш шырокія палотны. Купала піша паэму «Курган» і «Бандароўна», а Колас, пасаджаны ў 1908 годзе за рэволюцыйную дзейнасць у менскую турму, працуе над вялікім эпічным палатном—паэмай: «Новая зямля». Сіла паэтычнага таленту Янкі Купалы праявілася ў першых-жа яго вершах. Вялікая страснасць, заклікальнасць, імкненнасць, гатоўнасць загінуць або перамагчы тыранію царызма—характэрны для яго. Усё гэта адпаведным чынам сказалася на рытмічным баку верша. Пісьменнік Багдановіч сучаснік Купалы вельмі ўдала ўлавіў асаблівасць рытма купалаўскай лірыкі. Вось што ён піша:

«Гэтая перамена зместу адбілася і на форме вершаў Купалы, асабліва на іх важнейшым, усё ажыўляючым нерве—моцна забіўшым рытме. Буйны, шпаркі, ён падмывае, захоплівае чытача, гіпнатызуе яго, не дае апомніцца і нясе яго ўсё далей і далей. Бадай што ва ўсіх леташніх вершах Купалы б'ецца ён з вялікай сілай і гуртуе вакол сябе ўсё іншае ў іх. Каб задаволіць яго разгон, канцы радкоў аж звіняць, з'яўляюцца рыфмы і на сярэдзіне верша, нават словы да яго падбіраюцца звычныя, моцныя; а калі ў мове сталеццямі гнуўшагася беларускага народа не хапае іх, дык Купала ўжывае новыя, выкаваныя ім самім: ні ў аднаго нашага паэта няма такога багатага славара, як у Купалы».

Янка Купала ў годы 1913—1916 піша паэмы «Курган» і «Бандароўна»,—лепшыя з яго дарэволюцыйных паэм. «Курган»—паэма пра князя, які хацеў за грошы купіць народнага гусляра. Але гусляр пайшоў на смерць, а не схлусіў у сваіх песнях. Вобраз стогадовага гусляра, сівога, мужыка напісан Купалам у яркіх рамантычных фарбах.

Купала бліскуча скарыстаў народную лягенду пра «Бандароўну». На тэму гэтай лягенды ён напісаў паэму, накіраваную супроць польскіх паноў. Ён разгарнуў матыў абурэння, які ёсць у народнай песні, да паказу ў паэме паўстання украінскага народа супроць палякаў:

Весць аб смерці Бандароўны
Скрозь прайшла, як мора;
Зашумела Украіна—
Гора панам, гора,
Бандарэнка сходы кліча,
Усім аб крыўдзе кажа;
Войска сільнае збірае,
Роўна сіле ўражай.

Такім чынам, падводзячы вынікі сказанаму пра рэволюцыйна-дэмакратычную спадчыну Янкі Купалы, трэба адзначыць наступнае.

Купала стварае творы палітычнай лірыкі—вершы аратарскага, трыбунскага голасу, вялікай эмацыянальнай сілы і простага, чыста народнага складу («Што ты спіш», «Там», «Перад вясельняй», «Воля» і інш.).

Побач з гэтым мы сустракаем у паэта больш спакойныя бытавыя замалёўкі цяжкога жыцця селяніна, якія завяршаюцца лірычнай ці рытарычнай канцоўкай (гэта, галоўным чынам, вершы першага зборніка «Жалейка»).

У другі перыяд творчасці галоўным чынам у годы 1915—18, мы бачым у Купалы яшчэ большую фармальную дасканаласць верша, але пад уплывам сімвалістаў паэт усё больш і больш замыкаецца ў свае асабістыя тужлівыя мары. У гэты час ён піша надзвычайныя філасофскія вершы і вершы пра прыроду. («Адцвітанне». «У начным царстве», «Дзве таполі», «Плача восень», «Снег», «Званар», «Зачараваная кветка»), многія з якіх перакладзены на рускую мову В. Брусавым і Эд. Багрыцкім.

Лірыка Якуба Коласа па сваіх мастацкіх якасцях адрозніваецца ад лірыкі Купалы. Яна больш мяккая, часцей у ёй трапляюцца сентыментальныя ноткі. Колас больш чым Купала аддае месца пейзажу, рэчы і з'явы ў яго прыраўноўваюцца да прыроды. Найбольш моцна Колас праявіў сябе не ў лірыцы, вядома, а ў эпасе, у яго надзвычайнай паэме «Новая зямля».

Паэма «Новая зямля» з'яўляецца адной з яркіх старонак, вяршынай рэалізма ў дарэволюцыйнай беларускай літаратуры. Яна ёсць плод вялікага жыццёвага вопыту, накопленага пісьменнікам на працягу дзесяцігоддзяў жыцця, і блізкай сувязі з масамі беларускага працоўнага сялянства. Перад чытачом праходзіць цэлая эпапея сялянскага жыцця ва ўсіх найдрабнейшых дэталях і праяўленнях.

У чым-ж моц гэтага твору? Вядома, што «Новая зямля» не вызначаецца ні навізной тэхнікі, ні арыгінальнасцю рыфм, ні многастайнасцю рытма. Наадварот, яна напісана пераважна канонічным чатырохстопным ямбам, і сіла яе зусім не ў фармальных вартасцях. Сіла паэмы Коласа ў глыбока рэалістычным адлюстраванні лёсу беларускага сялянства, якое паўперызавалася. Вобраз уласніка Міхала, які марыць усё сваё жыццё аб сваім шматку зямлі, ненавідзіць панскую няволю больш за ўсё на свеце, які паміраe з дарэмнымі надзеямі на «сваю зямлю», «свой родны куток»,—вобраз глыбока праўдзівы і выражае тыповыя рысы селяніна-ўласніка. Сам Якуб Колас спачувае ідэалам і імкненням Міхала.

Але характэрна, што рэалізм разбівае ўшчэнт усе ўласніцкія ілюзіі, якія былі ўласцівы і герою паэмы Міхалу і—часткова—самому аўтару. Рэалізм агаляе ўсю нежыццёвасць і ўтапічнасць мар уласніка-селяніна пра шчасце на сваім шматку зямлі: Міхал гіне і яго пагібель, якая дае паэме трагічную развязку, з'яўляецца пагібелью ілюзіі дробнага таваравытворцы ў капіталістычных умовах.

Творы Коласа насычаны багаццямі беларускай народнай мовы, адценены гумарам, напоўнены народнымі песнямі, прыказкамі. (У гэтым сэнсе найбольш характэрным з'яўляецца раздзел «Падгляд пчол», у якім апісваецца святочны дзень у сялянскай сям'і).

Уся паэма, напісаная ў шырокім эпічным стылі, у простых, а часам і ў наіўных тонах, крыху перагружаная бытавымі дэталямі,—становіць сабой, аднак, узор скарыстання фальклора ў мастацкім творы. У самым значным раздзеле паэмы—раздзеле аб смерці Міхала, асаблівую манументальнасць і глыбіню думкі надае амаль цалкам нязмененай устаўленая надзвычайная народная песня—«У полі, полі, пры дарожачцы».

Такі асноўны сэнс аднаго з выдатных твораў Якуба Коласа, паэмы «Новая зямля».

Побач з дэмакратычнай паэмай «Новая Зямля» Колас піша «Сымона Музыку»—твор, непазбаўлены нацыяналістычных ілюзій, у якім глыбока-праўдзівыя малюнкі пераплятаюцца з цьмянымі сімваламі.

Шмат зрабіў для развіцця беларускай літаратуры Якуб Колас і ў галіне прозы. Яго бытавыя апавяданні—такія, як «Соцкі падвёў», «Стараста», «Бунт», «Злавіў», «Старыя падрызнікі», «Чорт», «Тоўстае палена»—у гумарыстычных тонах даюць малюнак дарэволюцыйнай беларускай вёскі і звычак яе кіраўнікоў: старшыні, старасты, папа і т. д.

Прастата, адсутнасць фармалістычнага штукарства—характэрна для творчасці Коласа і ў паэзіі і ў прозе.

Вершы яго пявучыя, рытмічна многастайныя, простыя, не беспрадметныя, а заўсёды пабудаваны на жывым малюнку, сюжэце. Харaство беларускай прыроды ён адчувае незвычайна глыбока і апеў яе ў радасных песнях. Асабліва блізкі і знаёмы яму каларыт старога Палесся.

Мастацкая проза Коласа дае вялікую колькасць выразных і рэалістычнымі фарбамі намалёваных чалавечых характараў, мова яго багатая і народная, яна па-майстэрску адценена гумарам.

Першы з рускіх пісьменнікаў, які заўважыў Купалу і Коласа, быў А. М. Горкі. Яшчэ ў 1911 годзе ён пісаў пра беларускую літаратуру.

«Я звяртаю ўвагу скептыкаў на маладую літаратуру беларусаў, самага забітага народа ў Расіі... Дазволю сабе падаць песню, выданую нядаўна «Нашай Нівай». Словы напісаны беларускім паэтам Янкам Купалам:

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
— Беларусы.
А што яны нясуць на худых плячах,
На руках у крыві, на нагах у лапцях?
— Сваю крыўду.
А чаго-ж, чаго захацелася ім,
Пагарджаным век, ім, сляпым,
глухім?
— Людзьмі звацца.»

У гэтым вершы, які Горкі назваў «красамоўнай і суровай песняй», нацыянальна-вызваленчыя патрабаванні Янкі Купалы выказаны з вялікай сілай. У вершы, якому Аляксей Максімавіч прарочыў зрабіцца гімнам нацыянальна-вызваленчай барацьбы беларускага народа, паказаны забітасць і прыніжанасць шматмільённага народа.

У пісьме да Кацюбінскага Горкі зноў варочаецца да цудоўнага твору Янкі Купалы. Ён піша, што яго «гэта рэч усхвалявала. Змрочна.. Памятаеце вялікарускую песню «Мы не сами то идем, нас нужда ведет, нужда горькая». Гэта эпіграф,—піша далей А. М. Горкі,—да нашай гісторыі, гісторыі пасіўных людзей. Гэта крык старадаўняй крыві, атручанай фаталізмам.

Іменна пад гэта няшчасце Л. Н. *) і падводзіў філасофскую аснову, ад яго выходзячы, яму падпарадкавацца клікаў».

Адзначаючы выдатныя якасці двух, тады маладых, беларускіх паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, Горкі падкрэсліваў, што яны «проста пішуць, так ласкава, сумна, шчыра. Нашым-бы хоць крыху гэтых якасцей. Вось добра было-б, божа!»

Гэта высокая ацэнка творчасці Купалы і Коласа паказвае прадбачлівасць вялікага пролетарскага пісьменніка, які ўжо тады разгадаў сілу двух выдатных майстроў беларускай літаратуры.

Нельга не адзначыць, што на творчасць Купалы і Коласа моцны ўплыў зрабілі вялікі паэт А. С. Пушкін, у асаблівасці-ж Некрасаў і Шаўчэнка. Іменна, наследуючы Некрасаву і Шаўчэнку, складалі свае раннія горкія песні нашыя народныя паэты.

У 1908 годзе ў літаратуры выступае Максім Багдановіч—паэт сімваліст, які не мала зрабіў фармальнай дасканаласці беларускай літаратуры. Багдановіч даў рад добрых перакладаў на беларускую мову з рускай, украінскай, іспанскай, французскай, нямецкай і фінскай паэзіі. Ён перакладаў Пушкіна, Шаўчэнку, Гейне, Верлена і Верхарна.

Максім Багдановіч напісаў рад высокамастацкіх вершаў («Межы», «Ёсць на свеце такія бадзягі», «Страцім лебедзь», «Вераніка», «Не кувай ты, шэрая зязюля», «Млынар і яго дачка»), галоўным чынам сімвалістычнага характару.

Бура, завіруха, адкрытая магіла, цікавы гістарычны факт, вычытаны з кнігі, філасофская думка, пахмурныя і скульптурна-выразныя вобразы народнага эпаса—вось аб'екты паэзіі М. Багдановіча.

Сімвалістычныя школа, а таксама моцны ўплыў нацыяналістаў з «Нашай Нівы», не давалі выйсці паэзіі Багдановіча ў свет вялікіх тэм і ідэй.

Следам за Максімам Багдановічам у 1910 годзе пачынае друкаваць свае імпрэсіі Змітрок Бядуля. Ён адразу звярнуў на сябе ўвагу як арыгінальны талент. На фоне натуралістычнага засілля ў тагочаснай беларускай прозе Бядуля імкнуўся ў сваіх імпрэсіях філасофска асэнсаваць з'явы жыцця. Пазней яго раннія імпрэсіі выйшлі ў зборніку «Абразкі». Побач з празаічнымі творамі Бядуля працуе і ў галіне верша, галоўным чынам сімвалістычнага. У вершах яго пераважалі эпічна-суровыя малюнкі прыроды, часта ў іх з вялікім майстэрствам скарыстоўваліся вобразы народнай міфалогіі. Рытмічныя ходы амаль заўсёды былі незвычайнымі, рабіўся ўпор на нутраную сугучнасць верша, на навізну рыфмы, асанансу.

Асабліва каштоўнымі з'яўляюцца наступныя рэалістычныя апавяданні Бядулі, якія ўвайшлі ў зборнік «На зачарованых гонях». Трэба вылучыць навелы: «Пяць лыжак заціркі», «Малыя дрывасекі», «Вялікодныя яйкі», «Чараўнік», «Ашчаслівіла», «Сорам», «Панас на небе». Бядуля ў сваіх навелах раскрывае (вельмі часта і пры дапамозе гумару) трагічныя бакі дарэволюцыйнай, убогай, забітай беларускай вёскі. Ва ўсіх гэтых творах пісьменніка вобраз селяніна-бедняка, якога ненавідзіць вясковае начальства, які даведзен падаткамі, беззямеллем да галечы, бедняка, над якім здзекваецца кулацтва—паказаны з вялікай сілай і праз гумар, якім надзяляе яго аўтар, выяўляецца глыбокі трагізм. Вось перад намі стаіць хударлявая сагнутая постаць бедняка Ігналя, збітага кулаком Марцінам да поўсмерці за ўкрадзены для галоднай скаціны мяшок сена. Ігналя стаіць абкружаны тупой абыякавасцю кулакоў, якія рыхтуюцца да самасуду. Ён перажывае жах пабояў, ён перажывае страшны шлях ад хаты Марціна да сябе дамоў з мяшком сена, падараваным на беднасць «дабрадзейным» Марцінам. Гэта апавяданне выклікае найманцнейшую нянавісць да кулацтва. Такім чынам, лепшыя рэволюцыйна-дэмакратычныя старонкі творчасці Змітрака Бядулі заключаны ў яго навелах, у яго мастацкай прозе.

Пролетарская культура, як вядома, не вырастае на пустым месцы, яна крытычна засвойвае ўсю найбагацейшую культуру, створаную чалавецтвам.

Такім-жа чынам і беларуская совецкая літаратура скарыстоўвала, побач з найбагацейшай шматвяковай культурай брацкага нам рускага народа, даволі вялікую літаратурную рэволюцыйна-дэмакратычную спадчыну такіх майстроў, як Купала, Колас.

*) Л. Н. Талстой.

Памёр пісьменнік А. П. Чапыгін

21 кастрычніка вечарам у Ленінградзе памёр вядомы пісьменнік Аляксей Паўлавіч Чапыгін.

***

Совецкая літаратура панесла вельмі вялікую страту. Памёр Аляксей Паўлавіч Чапыгін.

Яго гістарычныя раманы «Разін Сцяпан» і «Гулящыя людзі» лепшыя



раманы аб сялянскім рэволюцыйным руху ў Расіі—ведала і цаніла ўся наша краіна.

Уся пісьменніцкая грамадскасць любіла Чапыгіна не толькі як буйнейшага майстра мастацкага слова, але і як чалавека крышталёвай чэснасці, вялікага сэрца, як пісьменніка—грамадскага работніка.

Не выпадкова з асаблівай цеплынёй і ласкавасцю адносіўся да Чапыгіна Максім Горкі.

Выхадзец з асяроддзя бяднейшага сялянства, Чапыгін на самым сабе адчуў увесь жах бяспраўя і зневажэння сялянскай масы ў царскай Расіі. З падкупляючай прастатой і сілай ён расказаў пра гэта ў сваёй аўтабіяграфічнай аповесці «Жыццё маё».

Чытаючы палкія, трагічныя старонкі гэтай аповесці, здзіўляешся: як выжыў чалавек у такіх дзікіх умовах, як не надламаўся, як не загінуў.

Здзіўляешся і радуешся. Не толькі выжыў, не толькі не загінуў, а загартаваўся, вырас у вялікага пісьменніка, вялікага чалавека.

Сын шматмільённага сялянства, Чапыгін у народзе, у моцнай сувязі з ім шукаў і знаходзіў сілы, якія дапамаглі яму адолець «свінцовыя агіднасці расійскай рэчаіснасці».

Яго не зламалі ні вясковая цемра, не галоднае існаванне піцерскага майстравога. У вялізнай нястачы і пакутах загартоўваўся гэты здзіўляючы самародак.

Вялікая Пролетарская рэволюцыя адкрыла перад Чапыгіным, як і перад усёй многамільённай сялянскай масай, магчымасці не толькі годнага чалавечага існавання, але і росту і развіцця яго прыроднай здатнасці. Таму з Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыяй разгарнулася дараванне Чапыгіна ва ўсю сваю шырыню і магутнасць. Свайму народу, сваёй радзіме, сваёй рэволюцыі Чапыгін плаціў бязмежнай любоўю і адданасцю.

Цяжка было без хвалявання назіраць, як ужо старым чалавекам Чапыгін актыўна і радасна прымаў удзел у грамадскім жыцці саюза пісьменнікаў, выступаючы на нашых сходах, вітаючы ўсё новае, радуючыся росту, сіле нашай краіны.

У асобе Чапыгіна мы страцілі не толькі буйнейшага пісьменніка і выдатнага чалавека, але і вернага, стойкага сына нашай соцыялістычнай радзімы.

Н. Тіханаў, Міх. Зошчанка, Бар. Лаўрэнеў, Ільля Садоф'еў, В. Саянаў, А. Шабанаў, Сяргей Сямёнаў, Г. Мірошнічанка, П. Мядзведзеў.

В. Н. КРЫЛОВІЧ

Пасля цяжкай хваробы 23 красавіка ў 9 гадзін вечара памёр выдатны актор беларускага тэатра, член ЦВК БССР Владзімір Нікалаевіч Крыловіч.

Калектыў Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра, у якім Владзімір Нікалаевіч працаваў амаль з пер-



шых дзён яго заснавання, страціў свайго старэйшага і старшага таварыша і таленавітага майстра.

Владзімір Нікалаевіч Крыловіч у калектыве БДДТ прадстаўляў вядучую групу актораў. У ім, у яго мастацтве найбольш ярка выяўлены рэалістычныя тэндэнцыі ў большасці калектыва, творча найбольш моцнай яго часткі. Яснасць думкі, шчырасць пачуцця, выключная здольнасць тыпізаваць, адабраць найбольш яркае, характэрнае, абагуліць у жывым, поўнакроўным мастацкім вобразе, насыціць гэты вобраз мностам розных дзейных дэталяў, ачалавечыць вобраз—вось чым вызначаецца работа Крыловіча.

Створаныя ім вобразы—Інжынер Чужакоў у «Мосце», вынаходца Мароз у «Гуце», энтузіяст-прафесар Чападаў у «Жыццё кліча»,—найбольш паказальныя для яго метаду работы. Але яго творчая спадчына не абмяжоўваецца пералічанымі вышэй вобразамі. Владзімірам Нікалаевічам выканана ў БДДТ вечэзная колькасць самых рознастайных роляў, большасць якіх стаіць на выключна высокім мастацкім узроўні. Гэта ролі Муфці—«Мешчанін - дваранінам», Матыс — «Польскі яўрэй», Тарквіній—«Жрэц Тарквіній», Рудальнік «Чырвоная маска», Крэспо—«Вясковы суддзя», Шэгабудзінаў у «Мяцежы», Вяршынін у «Бронецягніку», Баеў у «Ярасці» і інш.

Апошнія годы Владзімір Нікалаевіч здымаўся ў кіно ў фільмах «Двойчы народжаны» і інш.

Калектыў БДДТ у асобе заслужанага артыста рэспублікі Владзіміра Нікалаевіча страціў не толькі свайго лепшага майстра, лепшага актора нашай рэспублікі, выключна адоранага чалавека наогул, які ўмеў цікава маляваць, чарціць, ляпіць, выразаць па дрэву і быў здольным музыкантам,—калектыў БДДТ страціў свайго лепшага сябра, аднаго з сваіх настаўнікаў, на работах якога выхоўвалася моладзь тэатра. Вось чаму калектыву БДДТ асабліва цяжка перажыць гэту смерць.

Але чым большая страта, тым больш мацнеюць сілы і жаданне працаваць, ствараць вялікае совецкае мастацтва, вылучаць і выхоўваць новыя маладыя таленты, якімі так багаты наш народ, вызвалены Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыяй.

Бывай, дарагі Владзімір Нікалаевіч. Вечная памяць табе!

Е. Рамановіч, А. Гайдарын, Л. Рахленка, М. Зораў, Засл. артыст рэспублікі В. Владзімірскі, Л. Ржэцкая, Н. Рамановіч, О. Галіна, Г. Грыгоніс, Е. Міронава, Б. Платонаў.

РАЗВІТАННЕ

У тэатры стаяла ўрачыстая цішыня. Толькі медзь аркестра гукамі пахавальнага марша парушала гэты тужлівы спакой. На сцэне, дзе зусім яшчэ нядаўна жыў і тварыў таленавіты і яркі артыст Владзімір Нікалаевіч Крыловіч, ляжыць яго цела на чырвоным пастаменце, які ў кветках і вянках. На апошняе развітанне ў ганаровую варту становяцца сябры па працы, акторы, рэжысёры, драматургі, кіруючыя работнікі мастацтваў, сваякі.

25 кастрычніка ў 4 гадзіны дня ў памяшканні Белдзярждрамтэатра адбылася грамадская паніхіда па нябожчыку заслужанаму артысту БССР Владзіміру Нікалаевічу Крыловічу.

З развітальнай прамовай ад імя Урадавай камісіі выступіў тав. Рубінштэйн. Ён сказаў:

— У асобе Крыловіча совецкае мастацтва страціла буйнага майстра беларускага тэатра.

З болем развітваліся з нябожчыкам тт. Броўка ад Саюза пісьменнікаў, Моін ад Яўрэйскага тэатра і Рахленка ад Белдзярждрамтэатра.

Яны адзначалі рознабаковасць таленту гэтага чалавека, любімага артыста беларускага народа, рэалістычнасць яго мастацтва, уменне адчуваць асаблівасці совецкага чалавека, багацце пачуццяў, якія ён так ярка ўвасабляў у вобразах рабочага, калгасніка і інтэлігента.

Зноў гучыць медзь пахавальнага марша. Гэта апошні шлях Владзіміра Нікалаевіча. На могілкі яго праважае вялікая працэсія таварышоў і пачытальнікаў яго вялікага таленту.

Апошняе развітанне... На свежую магілу ўскладзены вянкі ад калектыва тэатраў—Белдзяржрамтэатра, опернага, яўрэйскага, дзіцячага, ад віцебскага, ад арганізацый: ЦВК БССР, Упраўлення па справах мастацтваў, секцыі драматургаў ССПБ, ЦП працмастацтва, ад настаўніцтва, студэнтаў і шмат іншых.

У ПРАЎЛЕННІ ССПБ

22 кастрычніка адбылося чарговае пасяджэнне Праўлення ССПБ. Стаяла пытанне аб падрыхтоўцы да дваццацігоддзя Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі ў радзе галін работы.

Сёлета пісьменнікі БССР святкуюць гадавіну Кастрычніка разам з 15-ю лепшымі калгаснікамі Лепельшчыны.

Калгасныя госці ў кастрычніцкае свята будуць жыць у Доме пісьменніка, у трох добра абсталёваных пакоях. З імі будуць праведзены гутаркі аб Сталінскай Канстытуцыі, выбарах і выбарчым законе і аб пастанове СНК СССР і ЦК ВКП(б) пра дапамогу беларускім калгаснікам. Гутаркі правядуць: Я. Купала, Я. Колас, М. Лынькоў, І. Гурскі, П. Броўка і С. Крывіца.

Пісьменнікі разам з калгаснікамі наведаюць кіно, тэатр, выстаўку «БССР за 20 год», Дом Чырвонай Арміі і інш. Кожнаму гасцю ў падарунак будзе паднесена бібліятэчка з грамадска-палітычнай і мастацкай літаратуры.

У дні свята праўленне арганізуе таварыскую сустрэчу з стаханаўцамі Аўтарэмзавода.

Тав. Мікульскі (прадстаўнік ДВБ) паведаміў праўленне аб выданні кастрычніцкай серыі твораў мастацкай літаратуры. Да 20-й гадавіны Кастрычніка выйдуць (проза): «Дрыгва» Коласа і «Дачка эскадрона» Э. Самуйлёнка; вершы—зборнік «Беларусь ордэнаносная», Я. Купалы, кніжка Я. Броўкі, «Время близится» І. Шапавалава, дзве кніжкі «Ленін і Сталін у беларускай літаратуры» і «Сталін у беларускай паэзіі».

З кастрычніцкай серыі ў падарунак дзецям выдаюцца: «Міхасёвы прыгоды» Я. Коласа, «Міколкін паравоз». М. Лынькова, «Як гартавалася сталь» Н. Остроўскага і «Каваль Вярнідуб» А. Якімовіча.

Кніжкі кастрычніцкай серыі багата афармляюцца і выдаюцца на добраякаснай паперы. У канцы кастрычніка ўсе гэтыя кнігі паступяць у продаж.

Тав. Александровіч паінфармаваў праўленне аб арганізацыі аддзела совецкіх беларускіх пісьменнікаў на выстаўцы «БССР за 20 год».

Праўленне прыняло ў кандыдаты ССП маладога празаіка, равесніка Кастрычніка т. Кандраценю.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР з глыбокім жалем паведамляе аб заўчаснай смерці члена ЦВК БССР заслужанага артыста рэспублікі

Владзіміра Нікалаевіча КРЫЛОВІЧА

якая паследавала 23 кастрычніка г. г. і выражае свае спачуванне сям'і памершага.

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР выказвае глыбокі жаль з прычыны заўчаснай смерці заслужанага артыста рэспублікі, члена ЦВК БССР таварыша

Владзіміра Нікалаевіча Крыловіча

Дырэкцыя, МК і калектыў работнікаў Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра з вялікім жалем паведамляюць аб заўчаснай смерці заслужанага артыста рэспублікі, члена ЦВК БССР тав.

Владзіміра Нікалаевіча КРЫЛОВІЧА

паследваўшай 23 кастрычніка 1937 года, і выказвае свае спачуванне сям'і памершага.

Дырэкцыя, МК і калектыў работнікаў Рускага дзяржаўнага тэатра БССР глыбока смуе з прычыны цяжкай утраты, заўчаснай смерці надзвычайнага майстра заслужанага артыста рэспублікі члена ЦВК БССР

Владзіміра Нікалаевіча КРЫЛОВІЧА

і выражае свае спачуванне калектыву Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра і сям'і памершага.

Калектыў работнікаў Дзяржаўнага дзіцячага тэатра БССР выказвае глыбокі жаль з поваду заўчаснай смерці заслужанага артыста, члена ЦВК БССР

Владзіміра Нікалаевіча Крыловіча

Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі: Менск, Совецкая, 68, Дом пісьменніка. Друкарня імя Сталіна. Галоўлітбел № 3073.